ПАДАРОЖЖА НА КАРЫСЦЬ ДУШЫ

АДКУЛЬ БЯРУЦЦА ШКОДНЫЯ ЗВЫЧКІ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 ЧЭРВЕНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 113 (29482)

ЦЫТАТА ДНЯ

Анжаліка НІКІЦІНА, намеснік міністра эканомікі:

«На бягучую пяцігодку плануецца прыцягнуць прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове ў памеры больш за $5,5 млрд. Сферы прымянення вядомыя, яны былі агучаны на Усебеларускім народным сходзе. У асноўным сродкі будуць накіраваны ў індустрыяльны парк «Вялікі камень», на развіццё высокатэхналагічных, інавацыйных праектаў, тэрыторый свабодных эканамічных зон».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

КОРАТКА

- **ВУП Беларусі ў студзені — маі вырас на 3,1 %.**
- Новы рэзідэнт «Вялікага каменя» будзе весці навуковыя распрацоўкі ў сферы беспілотнага транспарту.
- **Прафсаюзы фіксуюць рост цэн на будматэрыялы.**
- У Беларусі за пяцігодку плануюць пабудаваць больш за 2 млн кв. м электрадамоў.
- **Патрэба беларусаў у малацэ і мясе цалкам задавальняецца за кошт айчынных тавараў.**
- Медыкам Віцебскай вобласці перадалі 14 машын хуткай дапамогі.
- **Каранцін ва Украіне прадоўжаць да 31 жніўня.**
- У Беларусі ўзгоднена павышэнне цэн на дзіцячае харчаванне, хлеб і хлебабулачныя вырабы.
- **Мотавелазавод праз прафсаюз перадаў мінскім медыкам 20 ровараў.**

Кожны трэці

ТОЙ САМЫ ДОЎГІ ДЗЕНЬ...

22 чэрвеня 1941 года раздзяліла жыццё беларусаў на «да» і «пасля»

Вайна бязлітасна ўварвалася ў лёсы людзей: зруйнавала гарады і вёскі, разлучыла бацькоў з дзецьмі, жанчын з мужамі, знішчыла цэлыя сем'і... Пра першых яе герояў і ахвяр распавядае часовая экспазіцыя «Сорак першы: вобразы вайны і міру», якая адкрылася ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Выстава прысвечана памяці тых, хто першым прыняў на сябе ўдар ворага. І гэта не толькі героі Брэсцкай крэпасці...

СТАР. 13

Прыёмная кампанія — 2021

Ігар ПЕТРЫШЭНКА:

«ЦТ — СПАБОРНІЦТВА, І ПЕРАМОГА Ў ІМ ПАВІННА БЫЦЬ ЧЭСНАЙ!»

Сацыяльнае дыстанцыраванне і напаўняльнасць да 50 чалавек — такія патрабаванні прад'яўляюцца сёлета да аўдыторый, дзе праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне. Пандэмія COVID-19 па-ранейшаму дыктуе свае ўмовы і прымушае з ёй лічыцца. Але калі летась усё было нязвыклым і рэзала вока (антысептыкі на ўваходзе, абавязковыя маскі і пальчаткі ў арганізатараў у экзаменацыйных аўдыторыях, маскі на тварах абітурыентаў), то сёлета на такія «дробязі» ўжо мала хто звяртае ўвагу. Гэта наша будзённасць.

16 чэрвеня ў краіне стартаваў экзаменацыйны марафон. І першымі ў пункты здачы цэнтралізаванага тэсціравання прыйшлі абітурыенты, якія пажадалі здаваць беларускую мову. Па ўсёй краіне іх набралася 17,9 тысячы чалавек (летась было 18,5 тысячы).

У Беларускім дзяржаўным універсітэце для ўдзелу ў ЦТ па роднай мове зарэгістравалася каля 800 чалавек. Каб рассадзіць іх з улікам супрацьэпідэмічных патрабаванняў, давялося задзейнічаць 21 аўдыторыю ў трох карпусах. Для параўнання: рускую мову ў БДУ будуць здаваць 1,5 тысячы чалавек у першы дзень і 950 — у другі. Як расказаў **адказны сакратар прыёмнай камісіі ўніверсітэта Уладзімір СЦЯПАНАЎ**, гэта самы масавы экзамен.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У выпадку канфлікту кожны двор, кожны дом, галава сям'і павінны здолець абараніць сваю сям'ю, сябе і разам тую зямлю, на якой яны жывуць»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях тэрытарыяльнай абароны на Магілёўшчыне

У Шклоўскім райвыканкаме кіраўніка краіны сустрэлі міністр абароны Беларусі Віктар Хрэнін, Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр Вальфовіч, а таксама прадстаўнікі мясцовых органаў улады, перадае прэс-служба Прэзідэнта. Падчас кароткай размовы перад мерапрыемствам кіраўнік дзяржавы ўзгадніў прызначэнне намесніка старшыні Горацкага райвыканкама Андрэя Камко кіраўніком Шклоўскага раёна.

«Усе прысутныя тут разумеюць, наколькі вострае тое пытанне, якое мы будзем сёння абмяркоўваць, — пытанне забеспячэння нацыянальнай бяспекі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — За мінулы год мы на сабе адчулі, як дэструктыўнае інфармацыйнае ўздзеянне, эканамічны, палітычны ціск, якія ішлі з Захаду, уплывалі на светапогляд нашых людзей і штурхалі некаторых з іх фактычна на здраду ўласнаму народу. ***Заўсёды неабходна даваць такі адпор падобным дзеянням, каб у памяці ворага ён застаўся на многія гады. І на гэта здольная толькі ўсенародная абарона, калі мы ўсе будзем абараняць сваю зямлю».***

Прэзідэнт адзначыў, што прынятае 20 гадоў таму рашэнне аб стварэнні тэрытарыяльнай абароны за гэтыя гады пацвердзіла сваю мэтазгоднасць і ён перакананы, што паступіў правільна.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, аб'яднанне мясцовых уладаў з насельніцтвам умацоўвае здольнасць краіны процідзейнічаць знешнім і ўнутраным пагрозам. «У пытаннях развіцця тэрытарыяльнай абароны мы зрабілі нямала: як ваенныя мне дакладваюць, удасканалены спосабы выканання задач, забяспечана ўзгодненасць дзеянняў розных сілавых структур, павышана аператыўнасць, устойлівасць сістэмы кіравання тэрытарыяльнай абаронай. Праводзіцца мэтанакіраваная падрыхтоўка службовых асоб — ад губернатараў да камандзіраў рот і радавых байцоў тэрытарыяльных войскаў», — перадае словы Аляксандра Лукашэнкі яго прэс-служба.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў пачатку тыдня наведваў прадпрыемства па вытворчасці стралковай зброі і боепрыпасаў. Да іх стварэння якраз і падштурхнула неабходнасць умацоўваць матэрыяльна-тэхнічную базу войскаў тэрытарыяльнай абароны. ***«У выпадку канфлікту кожны двор, кожны дом, галава сям'і, па меншай меры, павінны здолець абараніць сваю сям'ю, сябе і, натуральна, усе разам тую зямлю, тэрыторыю, на якой яны жывуць. Вось гэта будзе ўсенародная абарона»,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, узровень падрыхтоўкі кіраўнікоў на месцах мае асаблівую значнасць у пытаннях тэрытарыяльнай абароны. Ад таго, наколькі поўна яны валодаюць станам справы з падрыхтоўкай сваіх падначаленых, ведаюць задачы і спосабы арганізаваць іх выкананне, залежыць агульны поспех у арганізацыі тэрытарыяльнай абароны. «Генеральны штаб, кіраўніцтва арміі і краіны дапамогуць вам, і ваенных дашлём для сувязі і дапамогі ў кіраванні арганізацыяй работы тэрытарыяльныміі войскамі. Але гэта будзе адзін-два чалавекі. Хутчэй за ўсё, можа быць нават кантралёр. Нам самім на месцах — старшыням райвыканкамаў і аблвыканкамаў — трэба навучыцца ваяваць. Трэба ведаць свае аб'екты, якія вы будзеце ахоўваць, ведаць кожнага чалавека ў твар», — заўважыў Прэзідэнт.

Таксама кіраўнікі на месцах павінны забяспечыць хуткую мабілізацыю грамадзян, якія падлягаюць мабілізацыі, звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама закрануў тэму забеспячэнасці транспартнымі сродкамі падчас мабілізацыі — усе кіраўнікі прадпрыемстваў, дзе такая тэхніка сканцэнтравана, у мірны час павінны ведаць, што гэтая тэхніка падлягае мабілізацыі, адзначыў Прэзідэнт.

«Словам, у любы момант прыехалі, паднялі па трывозе, трое сутак — і ўсё на месцах, ахоўваюць тыя аб'екты, якія трэба тут ахоўваць, — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка. — Да гэтага ў краіне ўсе павінны рыхтавацца пасля сённяшняга мерапрыемства. Адна з мэт сустрэчы — даць сігнал на месцы, каб яны падобным чынам у кожнай зоне (у нас іх 7), у кожным раёне былі гатовыя адмабілізавацца ў той тэрмін, у які будзе прынята рашэнне Прэзідэнтам. Каб усе пачулі адсюль, з гэтага кабінета, сігнал да таго, што ўсе павінны быць гатовыя».

Прэзідэнт звярнуў увагу, што галоўным памочнікам улады ў тэрытарыяльнай абароне з'яўляюцца мясцовыя органы ваеннага кіравання — ваенныя камісарыяты. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што некалькі гадоў таму яму прапаноўвалі перадаць іх у падпарадкаванне мясцовых органаў улады. Прэзідэнт не прыняў гэтыя прапановы, каб не ламаць сістэму, якая добра працуе.

Каментарый у тэму

Камандна-штабныя вучэнні з удзелам войскаў тэрытарыяльнай абароны пройдуць у хуткім часе ў Гродзенскай вобласці. Яны працягнуць серыю вучэнняў, якія ўжо адбыліся ў Магілёўскай вобласці і цяпер праходзяць у Брэсцкай вобласці. Пра гэта паведаміў журналістам **міністр абароны Віктар ХРЭНІН** па выніках сустрэчы з удзелам кіраўніка дзяржавы ў Шклоўскім райвыканкаме, перадае БелТА.

Паводле слоў кіраўніка ведамства, адной з важных задач для тэрытарыяльнай абароны з'яўляецца павышэнне навучанасці, зладжанасці дзеянняў войскаў. Для гэтага ў 2020 годзе было праведзена 50 мерапрыемстваў, сёлета — ужо 37.

Таксама значным мерапрыемствам падрыхтоўкі Узброеных Сіл будзе вучэнне «Захад-2021» у верасні гэтага года, дзе плануецца задзейнічаць і войскі тэрытарыяльнай абароны.

Віктар Хрэнін звярнуў увагу, што на стварэнне эфектыўнай сістэмы тэрытарыяльнай абароны спатрэбілася каля 20 гадоў. «Самае характэрнае — стаўленне людзей да гэтых пытанняў. Я не чуў, каб хтосьці паскардзіўся ці сказаў «не хачу», «не буду» выконваць задачы. Наадварот, людзі ідуць з ахвотай, у іх гараць вочы, яны разумеюць, што будуць абараняць сваіх родных і блізкіх, свой кавалак зямлі, а ў цэлым — нашу краіну», — падкрэсліў міністр абароны.

Эфектыўная эканоміка

Інвестыцыі і холдынг — будучыня «Івацэвічдрэва»

Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА азнаёміўся з работай ААТ «Івацэвічдрэў»

На прадпрыемстве, што выпускае драўнянастружкавыя пліты і мэблю, Раману Галоўчанку паказалі, як працуе вытворчасць. Кіраўнік Саўміна адзначыў эфектыўнасць работы завода. «Попыт вельмі вялікі на прадукцыю. Рынак расце, аб'ёмаў ужо цяпер не хапае, нягледзячы на тое, што гэта досыць магутная вытворчасць. Трэба яе павялічваць фактычна ў два разы», — перадае словы прэм'ер-міністра прэс-служба ўрада.

На яго думку, нават з павялічанымі аб'ёмамі будзем здольныя спажыць усю прадукцыю таварыства ўнутры краіны. «Гэта цяпер вузкае месца, якое неабходна пашыраць. Сёння вырашалі, як можна найбольш хутка рэалізаваць інвестыцыйны праект і запусціць новую вытворчасць на плошчах «Івацэвічдрэва», — адзначыў кіраўнік Саўміна.

Яшчэ адной тэмай размовы стала рэалізацыя холдынгавага праекта, на чале якога будзе «Івацэвічдрэў».

Паводле слоў Рамана Галоўчанкі, прапануецца засяродзіцца на тым, каб кіруючая кампанія галоўным чынам займалася ўкараненнем сучасных метадаў і тэхналогій кіраўніцкага ўліку. «Акцэнтаваць увагу на тым, каб прадпрыемствы не страчвалі грошы, напрыклад, на недахопах ва ўліку матэрыялаў, у рабоце з кліентамі. У збыце і продажах пакінуць вялікую долю самастойнасці, каб кожны адказваў сам за сябе, асабліва на фоне рынку, што расце. Замкнуць на сабе неабходна толькі цэнтралізацыю тых вялікіх аб'ёмаў сыравіны, якая спажываецца ўсімі прадпрыемствамі холдынга», — дадаў прэм'ер-міністр і заўважыў, што падыходы пакуль дыскусійныя.

Парламенцкі дзённік

ШЫРОКАЯ ГЕАГРАФІЯ ПЫТАННЯЎ

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў паўдзельнічалі ў міжнароднай анлайн-канферэнцыі «Беларусь і Кітай: агульная траекторыя развіцця». Арганізаваў мерапрыемства і рабочую пляцоўку Беларускі інстытут стратэгічных даследаванняў. На сустрэчы абмеркавалі ўплыў сучаснай міжнароднай абстаноўкі на беларуска-кітайскае супрацоўніцтва і сумесныя меры па супрацьдзеянні выклікам і пагрозам.

Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Святлана ЛЮБЕЦКАЯ адзначыла, што арыенціры развіцця Беларусі і Кітая ў многім супадаюць. «Нашы краіны выступаюць за захаванне прынцыпу неўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы, павагу да інтарэсаў суверэнных дзяржаў, што сёння як ніколі актуальна. Мы ўпэўненыя, што толькі на гэтай аснове магчыма будаваць узаемавыгадныя адносіны і вырашаць пытанні сусветнага парадку дня», — заявіла парламентарый.

Святлана Любецкая паведаміла, што парламентарыі дзвюх краін дасягнулі дамоўленасці павысіць узровень партнёрства ад рабочай групы да міжпарламенцкай камісіі. Яна падкрэсліла, што значнай тэмай для сумеснай дэпутацкай работы з'яўляецца прасоўванне ініцыятыў у сферы інфармацыйнай бяспекі на міжнародных пляцоўках.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Се СЯАЮН у сваім выступленні адзначыў, што супрацоўніцтва дзвюх краін прыносіць значныя вынікі для народаў. Па яго словах, развіццё беларуска-кітайскіх адносін характарызуецца пяццю асаблівасцямі. Па-першае, палітычныя ўзаемаадносіны бесперапынна ўзмацняюцца. Па-другое, гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва захоўвае добрую дынаміку. Нягледзячы на пандэмію, аб'ём тавараабароту летась паказаў рост амаль на 11 %. Са студзеня да красавіка 2021 года экспарт і імпарт тавараў склалі 1 мільярд 250 мільёнаў долараў, павялічыўшыся на 58 % у параўнанні з мінулым годам. Трэці фактар — гуманітарныя абмены, чацвёрты — міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. Пятая асаблівасць, як рэзюмаваў пасол, — узаемная дапамога і абмен вопытам у барацьбе з каранавіруснай інфекцыяй.

«Кітайска-беларускае супрацоўніцтва мае вялізны патэнцыял і шырокія перспектывы развіцця. Перад Кітаем і Беларуссю стаіць агульная задача — абарона свайго суверэнітэту, бяспекі і міжнароднай справядлівасці. Сёння мы жывём у перыяд, калі нябачныя за стагоддзі перамены і эпідэмія накладваюцца, пераплятаюцца. Свет уступіў у перыяд узрушэнняў і карэнных змен», — дадаў Се Сяаюн.

На думку дыпламата, сяброўства паміж краінамі заключаецца ў блізкасці народаў, а тая, у сваю чаргу, выходзіць з блізкасці сэрцаў.

Алег МАКАРАЎ, дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў, выказаў меркаванне, што ў аснове новых адносін павінны ляжаць не толькі прагматычныя выгоды ад гандлю, але і элементы духоўнай падтрымкі, адзінства, блізкасці палітычных ідэалаў, сацыяльных стандартаў. На гэтым базісе неабходна будаваць узаемныя адносіны.

«Вопыт беларуска-кітайскага супрацоўніцтва паказвае, што дзве розныя па маштабе дзяржавы маюць каласальны патэнцыял для ўзаемавыгадных адносін, сумеснага рэагавання на сістэму змянення міжнароднай абстаноўкі. Прыярытэтам у адносінах нашых краін з'яўляецца далейшае пераадоленне наступстваў пандэміі і адаптацыя да новых адносін паміж краінамі», — сказаў ён.

***

Пра тое, што ў міжнародных адносінах назіраецца асаблівая напружанасць, гаварылі і на анлайн-семінары Парламенцкай асамблеі АБСЕ на тэму «Празрыстасць і прадказальнасць у ваенных пытаннях: роля АБСЕ». Ад Беларусі на сустрэчы прысутнічалі члены Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Ігар Мартынаў і Яўген Зайцаў.

Па словах **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Ігара МАРТЫНАВА,** тэматыка семінара неад'емна звязана з Хельсінскім заключным актам, падпісаным у 1975 годзе. У дакументе адлюстравана, як павінна будавацца ўзаемадзеянне краін у шматлікіх галінах — эканоміцы, палітыцы, прававой, гуманітарнай і ваеннай сферах. Але ўсё, што адбываецца вакол нашай краіны цяпер, і тое, што прапісана ў акце, як дадае дэпутат, значна адрозніваецца.

«Калі возьмем замацаванне вынікаў Другой сусветнай вайны. Было дакладна прапісана неўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы краін і тэрытарыяльная цэласнасць дзяржаў. Сёння мы бачым яўныя спробы перагляду вынікаў Другой сусветнай вайны і тэрытарыяльнай цэласнасці краін, — кажа Ігар Мартынаў. — Другое пытанне — эканамічная сфера. У акце прапісаны пытанні, што датычацца гандлю, эканамічных адносін, мірнага ўрэгулявання працэсаў. Мы бачым, як сёння гэта рэгулюецца: нас атакуюць санкцыямі, хутка саб'ёмся з іх ліку».

Парламентарый дадае, што ў дакументе вызначана, як павінны развівацца ўзброеныя сілы краін.

«Нас апошнім часам асабліва папракаюць, калі мы кожныя два гады праводзім сумесныя ваенныя вучэнні з Расійскай Федэрацыяй, што мы не адкрытыя, нешта хаваем, манім. Мы заўсёды запрашаем назіральнікаў на вучэнні, паказваем колькасць бакоў, асабовага складу. Мы заўсёды адкрытыя. Але ў адказ мы бачым, што адбываецца вакол нашых граніц і як павялічваецца інтэнсіўнасць вучэнняў», — акцэнтаваў увагу дэпутат.

Марыя ДАДАЛКА.

У цэнтры ўвагі

БЕЗ СПЫНЕННЯ ВЫТВОРЧЫХ ПРАЦЭСАЎ

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава наведала пляцоўку ААТ «МотаВелаЗавод»

Спікер верхняй палаты парламента, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы па Мінску Наталля КАЧАНАВА пабывала ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Мотавела», дзе азнаёмілася са станам вытворчых пляцовак. Такім было даручэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, які не так даўно наведваў гэтае прадпрыемства. Тады прагучала задача-абяцанне, якую агучыў Прэзідэнт у гутарцы з калектывам: «За пяцігодку завод павінен грымець на ўвесь свет».

Фота Бел ТА.

Нагадаем, што два месяцы таму, адказваючы на пытанне пра мэту візіту, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Так жыць нельга. І вы так больш жыць не будзеце». Беларускі лідар паставіў задачу: на працягу трох гадоў тэрыторыя мотавелазавода павінна цалкам быць прыведзена ў ідэальны стан, усе лішнія будынкі будуць знесены, а на вызваленай пляцоўцы павінен быць створаны Мінскі гарадскі тэхнапарк. Што ўжо зроблена пасля візіту кіраўніка дзяржавы і якія існуюць праблемныя пытанні ў рэалізацыі агучаных планаў?

Наталля Качанава азнаёмілася, як выконваецца пратакол даручэнняў Прэзідэнта, у прыватнасці, як вырашаюцца пытанні па навядзенні парадку на тэрыторыі прадпрыемства, які далейшы лёс маёмасці, якая не выкарыстоўваецца, і апусцелых збудаванняў. Яна прайшлася па цэхах, дзе часткова ўжо дэманціравалі вытворчае абсталяванне, пацікавілася ў кіраўніцтва далейшымі планамі.

— Важна, каб плошчы прадпрыемства, якія знаходзяцца ў цэнтры Мінска, выкарыстоўваліся эфектыўна, — звярнула ўвагу прысутных Наталля Качанава.

Як паведамілі спікеру Савета Рэспублікі, на тэрыторыі вытворчай пляцоўкі мотавелазавода плануецца правесці комплексную рэканструкцыю, якая будзе выконвацца паэтапна, з максімальна магчымым захаванням на кожным з этапаў плошчаў, якія арандуюцца.

Пасля завяршэння рэканструкцыі кожнага з этапаў (чэргаў) створаныя плошчы будуць запаўняцца інавацыйнымі кампаніямі, у тым ліку і тымі, якія ўжо размяшчаюцца на пляцоўцы, што прайшлі адпаведны адбор ва ўстаноўленым парадку.

У першую чаргу ўжо сёлета мяркуецца выканаць рэканструкцыю вытворчых карпусоў № 1 і № 2 з прыладай знешніх фасадаў у стылістыцы гістарычнай забудовы.

Другая чарга прадугледжвае рэканструкцыю корпуса № 3 і прыбудоў да яго, у якім у цяперашні час размяшчаецца вытворчасць вела- і мотатэхнікі (ТАА «МотаВелаЗавода»), і часткі арандатараў. Рэканструкцыю плануецца рэалізаваць без спынення вытворчых працэсаў прадпрыемства. Запуск рэканструкцыі другой чаргі павінен распачацца ўжо сёлета. Трэба сказаць, што ў планах — вылучэнне чатырох пускавых комплексаў работ па рэканструкцыі з завяршэннем у 2024 годзе.

Усяго запланавана восем чэргаў рэканструкцыі пляцоўкі, уключаючы добраўпарадкаванне, і ўвод іх у эксплуатацыю па чарзе штогод.

Пасля азнаямлення з заводам старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава правяла нараду па пытаннях развіцця вытворчай пляцоўкі прадпрыемства.

Як паведаміў **старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КУХАРАЎ,** Прэзідэнту ўнесена прапанова па зносе двух вытворчых карпусоў з адначасовым будаўніцтвам новых больш аб'ёмных збудаванняў, якія дазволяць павялічыць плошчы ў тры разы: з 45 тысяч «квадратаў» да 120. Гэта дасць магчымасць эфектыўней выкарыстоўваць рэсурс і дазволіць атрымліваць больш прыбытку.

З дакладамі аб комплекснай рэканструкцыі вытворчай пляцоўкі маёмаснага комплексу ААТ «Мотавела», акрамя кіраўніка сталіцы, выступілі Васіль ГЕРАСІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю, Пётр БРОЎКІН, першы намеснік старшыні Дзяржкамаёмасці, Сяргей ГУНЬКО, першы намеснік міністра прамысловасці.

Па выніках нарады Наталля Качанава падрыхтуе аналітычную запіску, у якой выкладзе кіраўніку дзяржавы далейшыя перспектывы выкарыстання плошчаў мотавелазавода і рэалізацыі планаў па развіцці вытворчасці.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Будзь у курсе!

На «Купалле» — цягніком

Прыехаць на свята «Купалле» ў аграгарадку Александрыя, размешчаным на стыку Магілёўскай і Віцебскай абласцей, традыцыйна можна па чыгунцы як рэгулярнымі цягнікамі з Магілёва, Оршы, Гомеля, Віцебска, Крычава і Полацка, якія робяць прыпынак на станцыі Копысь, так і дадатковымі рэйсамі.

Графік руху дадатковых цягнікоў складзены з улікам часу правядзення святочных мерапрыемстваў, паведамляе прэс-цэнтр магістралі.

Так, 10 ліпеня ў дапаўненне да дзеючага раскладу прызначаны цягнікі Магілёў — Копысь — Магілёў і Орша — Копысь — Орша. 11 ліпеня дадаткова прызначаны цягнікі Копысь — Магілёў і Копысь — Орша.

Набыць праязныя дакументы можна на афіцыйным сайце Беларускай чыгункі ў раздзеле «Паслугі пасажырам» (pass.rw.by) з дапамогай мабільнага дадатку «БЧ. Мой цягнік», а таксама ў чыгуначных касах БЧ.

Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць на афіцыйным сайце Беларускай чыгункі www.rw.by, а таксама ў Кантакт-цэнтры па тэлефоне 105.

Фотапаляванне — з «Белдзяржпаляваннем»

Незвычайны праект па вывучэнні і фарміраванні фотатураў запусціла «Белдзяржпаляванне». Ён называецца ECOhunt і арыентаваны на шырокую грамадскасць.

«Нядаўна мы бралі ўдзел адразу ў некалькіх буйных выстаўках, дзе прэзентавалі магчымасці па арганізацыі фотатураў. Убачылі, што людзям гэта цікава. Таму плануем развіваць кірунак», — цытуе прэс-служба Міністэрства лясной гаспадаркі словы **дырэктара прадпрыемства Вадзіма КРУЦЬКО.**

Найбліжэйшыя фотатуры плануецца арганізаваць у Рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Налібоцкі», дзе сёння налічваецца 917 відаў раслін, 163 віды птушак, 47 відаў млекакормячых, 34 віды рыбы, 12 відаў амфібій і 7 відаў рэптылій.

«З пункту гледжання фотатурызму гэта ўнікальнае месца», — перакананы Вадзім Круцько.

Цяпер «Белдзяржпаляванне» разам з Клубам фотаграфаў дзікай прыроды Беларусі праводзіць навучанне валанцёраў. У хуткім часе менавіта яны стануць гідамі для першых фотатурыстаў.

«Што датычыцца фотаапаратуры, гэта не абавязкова павінна быць прафесійная тэхніка, сёння зрабіць якасны здымак дазваляе нават камера на мабільным тэлефоне. У будучыні па меры развіцця гэтага праекта, магчыма, мы арганізуем пракат тэхнікі», — падзяліліся падрабязнасцямі ў «Белдзяржпаляванні».

Беларусь і свет

У горную мясцовасць на дзяжурства

Другі борт Мі-8 авіяцыі МНС Беларусі заступіў на дзяжурства ў турэцкім горадзе Кешан. Чакаецца, што камандзіроўка беларускіх экіпажаў працягнецца да позняй восені.

Як паведамляе МНС, два верталёты Мі-8 гатовыя да выканання задач па тушэнні пажараў у горна-лясістай мясцовасці і дастаўцы ратавальнікаў на недаступныя для наземнага транспарту тэрыторыі.

У міністэрстве нагадалі, што ў канцы мая авіяцыя МНС Беларусі ліквідавала буйны пажар паблізу горада Мілас, а ў першай дэкадзе чэрвеня — каля населенага пункта Яплі.

Беларусь не першы год аказвае дапамогу Турцыі ў тушэнні пажараў у экасістэмах. Нашы экіпажы зарэкамендавалі сябе як выдатныя спецыялісты, здольныя працаваць у складаных умовах горнай мясцовасці. Падобныя камандзіроўкі таксама дазваляюць беларускім авіятарам атрымаць значны вопыт у ліквідацыі надзвычайных сітуацый.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Калектыў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю ШАРШНЁВА Алега Данілавіча.

Аднойчы выбраўшы гандлёвую справу, Алег Данілавіч быў адданы ёй усё жыццё. Доўгія гады, узначальваючы ўпраўленне гандлю Магілёўскага аблвыканкама, ён быў дастойным прыкладам прафесіяналізму і мэтанакіраванасці, мудрасці і працавітасці для маладога пакалення.

Выказваем спачуванне родным і блізкім А. Д. Шаршнёва ў сувязі з горам, якое іх напаткала, і падзяляем іх смутак.

Беларускі саюз канькабежцаў глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю выдатнага беларускага канькабежца ЖАЛЯЗОЎСКАГА Ігара Мікалаевіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным, блізкім і калегам.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Эксперты паведамілі пра павелічэнне колькасці разгорнутых ядзерных боегаловак

Ядзерныя дзяржавы, нягледзячы на агульнае скарачэнне колькасці боегаловак, летась разгарнулі больш адзінак такіх узбраенняў у складзе аператыўных сіл. Такая выснова ўтрымліваецца ў чарговай справаздачы аб становішчы ў гэтай сферы, апублікаванай Стакгольмскім міжнародным інстытутам даследавання праблем міру. Як сцвярджаюць эксперты, на пачатак гэтага года дзевяць ядзерных дзяржаў — Расія, ЗША, Вялікабрытанія, Францыя, Кітай, Індыя, Пакістан, Ізраіль і Паўночная Карэя — валодалі 13 080 адзінкамі ядзернай зброі. Колькасць узбраенняў, якія меліся ў складзе аператыўных часцей, узрасла з 3720 да 3825 адзінак, а каля дзвюх тысяч знаходзілася ў стане высокай баявой гатоўнасці. Толькі ЗША і Расія ў параўнанні з мінулым годам на пачатак гэтага дадалі да свайго аператыўнага разгортвання прыкладна па 50 боегаловак.

Кіраўнік Ryanair выказаўся супраць забароны на выкарыстанне паветранай прасторы Беларусі

Кампанія Ryanair не падтрымлівае забарону на выкарыстанне паветранай прасторы Беларусі. Пра гэта заявіў выканаўчы дырэктар Ryanair Майкл О'Ліры, паведаміла Reuters. Выступаючы ў камітэце па транспарце Палаты абшчын парламента Вялікабрытаніі, ён заўважыў, што авіяцыйная прамысловасць у доўгатэрміновай перспектыве залежыць ад неабмежаванага доступу ва ўсю паветраную прастору і што яго неабходна аднавіць. Майкл О'Ліры заявіў, што ў доўгатэрміновай перспектыве палітызацыя паветранай прасторы не з'яўляецца адказам, паколькі гэта нанясе шкоду авіяцыйнай галіне і міжнародным сувязям. «Свабода палётаў над краінамі — гэта тое, што мы, магчыма, прымалі як належнае на працягу апошніх 70—80 гадоў, — сказаў О'Ліры заканадаўцам. — Мы павінны аднавіць яе як мага хутчэй». Раней паведамлялася, што генеральны дырэктар венгерскай Wizz Air Ёжэф Варадзі раскрытыкаваў еўрапейскія ўрады за забарону палётаў над Беларуссю, заявіўшы, што такія дзеянні зрабілі авіяцыю «цацкай палітыкі».

У Алжыры кіруючая партыя выйграла парламенцкія выбары

Кіруючая партыя «Фронт нацыянальнага вызвалення» (ФНВ) атрымала большасць месцаў у 407-м месным Нацыянальным народным сходзе (ННС) — ніжняй палаце парламента Алжыра — па выніках датэрміновых выбараў. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на Мухамеда Шарфі, кіраўніка Незалежнага нацыянальнага выбарчага органа, які кантралюе працэс галасавання. Паводле яго даных, ФНВ забяспечвае сабе сама меней 105 мандатаў у новым складзе ніжняй палаты парламента. Незалежным кандыдатам дасягнула 78 месцаў. А ўмераныя ісламісты з «Руху грамадства за мір» атрымліваюць 64 крэслы ў Нацыянальным народным сходзе. «Нацыянальнае дэмакратычнае аб'яднанне» (НДА) заваёўвае 57 мандатаў, партыя «Аль-Мустакбаль» — 48, а рух «Аль-Біна» — 40. Астатнія партыі забяспечваюць сабе ад аднаго да трох месцаў у ННС. Датэрміновыя выбары адбыліся ў сувязі з тым, што 18 лютага прэзідэнт краіны Абдэльмаджыд Тэбун распусціў ННС. Тлумачачы прычыны рашэння, ён падкрэсліў, што новыя выбары дазволяць «адчыніць дзверы для моладзі».

«ЦТ — СПАБОРНІЦТВА, І ПЕРАМОГА Ў ІМ ПАВІННА БЫЦЬ ЧЭСНАЙ!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Восенню БДУ рыхтуецца адзначыць свой векавы юбілей, таму ўпершыню за многа гадоў пад ЦТ не задзейнічалі галоўны корпус па праспекце Незалежнасці, дзе зараз праходзіць рэканструкцыя. Ва ўніверсітэцкім дворыку таксама поўным ходам ідуць будаўнічыя работы.

— Нам давялося загадзя прадумаць лагістыку і прыцягнуць на дапамогу валанцёраў з ліку студэнтаў, таму што мы разумелі: традыцыйная схема перамяшчэння паміж карпусамі цяпер немагчымая. Валанцёры, расстаўленыя па ўсім перыметры, дапамагаюць абітурыентам хутчэй сарыентавацца і трапіць у патрэбны корпус, — расказаў Уладзімір Сцяпанаў.

І ўсё ж маладым людзям трэба быць уважлівымі, таму што, акрамя юрыдычнага, хімічнага, фізічнага і геаграфічнага факультэтаў, размешчаных фактычна на адной кампуснай тэрыторыі, у асобныя дні ў ЦТ будуць задзейнічаны таксама філалагічны факультэт БДУ на вуліцы Карла Маркса і факультэт журналістыкі на Кальварыйскай. На пропусках на ЦТ з адваротнага боку ўказваецца дакладны адрас. А спазненне абітурыента на экзамен з-за ўласнай няўважлівасці азначае толькі адно: прыёмная кампанія для яго скончылася, не паспеўшы стартаваць. **Зарэгістравацца на рэзервовы дзень можна толькі па ўважлівай прычыне.** Абітурыент, які прыбудзе ў пункт правядзення ЦТ пасля распачатвання пакета з педагагічнымі тэстамі, у аўдыторыю не дапускаецца...

Афіцыйна ЦТ стартуе ў 11 гадзін, але за паўтары гадзіны да гэтага часу абітурыентаў ужо пачынаюць пускаць у карпусы. На ўваходзе ўсе праходзяць строгі фэйс-контроль: арганізатары супастаўляюць фота ў дакументах, так бы мовіць, з «арыгіналам». Ёсць толькі тры дакументы, якія сведчаць асобу: пашпарт грамадзяніна, від на жыхарства або пасведчанне бежанца. З натарыяльна заверанай копіяй пашпарта або правамі кіроўцы трапіць на ЦТ немагчыма. У выпадку, калі пашпарт згубіўся, трэба звяртацца ў РАУС, каб атрымаць даведку ўстаноўленага ўзору.

Усе арганізацыйныя моманты ў Белдзяржуніверсітэце добра прадуманы, таму чарга на ўваходзе хутка растварaецца. У 10.30 большасць абітурыентаў ужо занялі свае месцы. Перад аўдыторыяй хлопцы і дзяўчаты праходзяць яшчэ адзін пашпартны кантроль і цягнуць нумар свайго месца. Ад яго будзе залежаць варыянт тэста.

Каб асабіста пераканацца ў тым, што ўсё арганізавана належным чынам, у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт завітаў старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка. У яго прысутнасці з апламбаванага сейфа дасталі пакеты з бланкамі адказаў і педагагічнымі тэстамі. Іх у БДУ даставіла фельд'егерская служба ў 7 гадзін раніцы. Спецыяльныя пакеты маюць сакрэтную стужку, таму распячатаць іх непрыкметна, скажам, на шляху ад сейфа да памяшканняў, немагчыма. На кожную аўдыторыю запаўняецца акт, у якім пазначана не толькі колькасць бланкаў, але і іх нумары, таму чужыя бланкі апынуцца ў пакеце не могуць. Да таго ж і арганізатары ЦТ пацвярджаюць сваімі подпісамі, што менавіта гэты бланк знаходзіўся ў экзаменацыйнай аўдыторыі.

Дарэчы, дызайн бланкаў адказаў сёлета крыху зменіўся, але абітурыенты мелі магчымасць азнаёміцца з ім яшчэ на рэпетыцыйным тэсціраванні і падчас анлайн-тэсціравання на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Гэта звязана са зменамі структуры тэстаў. Традыцыйна тэст складаецца з часткі А, дзе прапануюцца закрытыя заданні з выбарам адказу, і часткі Б, дзе абітурыенту неабходна ўпісаць адказ самому, прычым без арфаграфічных памылак, інакш яго не залічаць. У гэтым годзе адбылося некаторае змяншэнне колькасці заданняў у частцы А і павелічэнне заданняў у частцы Б па шэрагу прадметаў. Ёсць змены і ва ўзроўнях складанасці заданняў: у частцы А ўвялі пяты дыстрактар (варыянт адказу). Павялічылася таксама колькасць практыка-арыентаваных заданняў. Як кажуць у Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў, усё нацэлена на тое, каб абітурыент пры рабоце над тэстам не проста дэманстраваў тэарэтычныя веды, але разам з тым паказаў, як ён можа іх прымяняць.

Гарачыя тэлефонныя лініі дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам уступных выпрабаванняў створаны для абітурыентаў на базе цэнтральнага апарата Камітэта дзяржаўнага кантролю і камітэтаў у абласцях. Нумары тэлефонаў: рабочай групы дзяржкамісіі ў Мінску — (8 017) 327 66 80; Брэсцкай абласной камісіі — (8 0162) 21 25 08 і 21 18 94; Віцебскай абласной камісіі — (8 0212) 37 61 82; Гомельскай абласной камісіі — (8 0232) 23 83 85; Гродзенскай абласной камісіі — (8 0152) 79 88 40; Магілёўскай абласной камісіі — (8 0222) 62 47 75 і 62 47 73 і Мінскай абласной камісіі — (8 017) 379 09 06 і 397 03 42. Гарачая лінія Міністэрства адукацыі — (8 017) 222 43 12.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Спецыяльныя пакеты маюць сакрэтную стужку, таму распячатаць іх непрыкметна, скажам, на шляху ад сейфа да памяшканняў, немагчыма.

— Мы лічым, што гэта дадаткова павялічвае шанцы абітурыентаў на паспяховую здачу экзамену. У іх будзе магчымасць прааналізаваць і выправіць сваю памылку, — падкрэсліў Ігар Петрышэнка. — Але пасля завяршэння часу, адведзенага на ЦТ, ніякія праўкі ўносіць ужо нельга.

Дарэчы, час пачатку і заканчэння выканання тэста ва ўсіх экзаменацыйных аўдыторыях фіксуецца на дошцы. А гадзіннікі размешчаны такім чынам, каб абітурыентам з любога месца было зручна сачыць за часам.

З улікам вопыту папярэдніх гадоў абітурыентаў папярэджваюць, што, калі падчас экзамену іх самаадчуванне пагоршыцца, трэба неадкладна паведаміць пра гэта арганізатарам у аўдыторыі. Медыцынскі работнік павінен засведчыць гэты факт, у такім разе абітурыент зможа здаць экзамен у рэзервовы дзень. Але здараюцца сітуацыі, калі пасля кансультацыі медыкаў абітурыент вяртаецца ў аўдыторыю і працягвае здаваць экзамен. А праз пару дзён заяўляе, што адчуваў сябе дрэнна, таму не змог належным чынам сканцэнтравацца. Просіць дапусціць яго да пераздачы экзамену ў рэзервовы дзень. Але пасля таго, як на пропуску з'яўляецца адзнака «тэсціраванне прайшоў», зрабіць гэта ўжо немагчыма. Таму варта адразу аб'ектыўна ацэньваць свой стан (асабліва з улікам спякоты). Час работы над тэстам нікому не падаўжаецца. Выключэнняў з правіла не бывае. Усё трэба рабіць своечасова.

Таксама арганізатары раяць абітурыентам быць уважлівымі пры запаўненні вобласці рэгістрацыі ў бланках адказаў, бо памылкі, дапушчаныя пры напісанні прозвішча і імя, потым дубліруюцца ў сертыфікатах. І гэты важны дакумент даводзіцца мяняць.

Учора ў ЦТ па беларускай мове па краіне былі задзейнічаны больш за 50 работнікаў Камітэта дзяржаўнага кантролю. А на ўсіх этапах уступнай кампаніі (прыёме дакументаў, правядзенні ўнутраных уступных выпрабаванняў ва ўстановах, залічэнні ў студэнты) будуць задзейнічаны 150 работнікаў. Пра гэта журналістам расказаў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення кантролю бюджэтнафінансавай сферы — начальнік упраўлення кантролю за работай галін сацыяльнай сферы КДК Віктар БУРЛО:**

— У пунктах тэсціравання зроблена ўсё, каб бланкі адказаў і тэставых заданняў трапілі ў рукі арганізацыйных камісій некранутымі. Праверана гатоўнасць пунктаў тэсціравання: сістэма пропуску, работа медпунктаў, арганізацыя месцаў для захоўвання асабістых рэчаў абітурыентаў, рассадка ў аўдыторыях. Таксама асобная ўвага аддаецца справядлівасці размеркавання членаў арганізацыйных камісій па аўдыторыях — гэта робіцца з дапамогай лёсавання ў прысутнасці кантралёраў. Ніякіх шпаргалак, мабільных тэлефонаў у аўдыторыі быць не павінна: кантралёры ўважліва сочаць, каб абітурыенты не скарысталіся нейкімі носьбітамі інфармацыі. А арганізатарам у аўдыторыях забараняецца мець ручкі з чорнымі чарнілами. Такія ручкі ёсць толькі ў абітурыентаў.

Спазненне абітурыента на экзамен з-за ўласнай няўважлівасці азначае толькі адно — прыёмная кампанія для яго скончылася, не паспеўшы стартаваць.

Віктар Бурло заўважыў, што з кожным годам колькасць парушэнняў парадку здачы ЦТ змяншаецца. Летась за розныя парушэнні былі адхілены 14 чалавек, у тым ліку 10 — за мабільныя тэлефоны і адна дзяўчына — за шпаргалку. Сёлета пакуль нейкіх заўваг да арганізацыі і правядзення тэсціравання ў КДК не было.

— Цэнтралізаванае тэсціраванне — гэта своеасаблівае спаборніцтва, і перамога ў ім павінна быць чэснай, — падкрэсліў Ігар Петрышэнка. — Гэта праверка на стрэсаўстойлівасць, дэманстрацыя ведаў і гатоўнасці ў будучыні паспяхова засвоіць праграму вышэйшай школы. Ніякіх звышнатуральных заданняў у тэстах няма — усе яны ў рамках школьнай праграмы. Маладыя людзі сканцэнтраваны і гатовы да выканання заданняў. Хто вучыўся і рыхтаваўся, абавязкова справіцца. Паспяховая здача ЦТ — гэта важная цаглінка ў фарміраванні кваліфікаванага спецыяліста, які нашай краіне вельмі патрэбны...

Усім абітурыентам віцэ-прэм'ер пажадаў поспеху, сабранасці і сумленнасці перш за ўсё перад сабой пры выкананні тэстаў. А ў выпадку, калі набраных балаў раптам не хопіць, ён параіў не адчайвацца. Тэрмін падачы дакументаў у ВНУ сельгаспрофілю прадоўжаны. Можна пайсці асвойваць тую ці іншую прафесію ў сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову, стаць добрым спецыялістам, а ў будучыні зноў паспрабаваць паступіць у вышэйшую навучальную ўстанову.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПРА ПАБІТЫЯ КАЛЕНКІ І НЕ ТОЛЬКІ

Як вы думаеце, што маладую маці можа выбіць з душэўнай раўнавагі? Не паверыце, пабітыя каленкі яе дзіцяці! Хто б мог падумаць, што я буду так перажываць з-за звычайнай рэчы. Лета, хлопчык, пабітыя калені — класіка жанру. Але калі падобнае адбываецца з тваім маленствам, успрымаеш сітуацыю інакш. Вядома, я не крычала на Цёміка, калі на мінулым тыдні забірала яго з дзіцячага садка з «зялёнымі» нагамі. Нават не падумала вінаваціць у недаглядзе выхавальніцу. Яна ўсё зрабіла правільна: памыла ранкі, апрацавала перакісам вадароду, намазала зялёнкай. Ды яшчэ, як потым расказваў сын, дзьмула на каленкі, каб малому менш балела.

Мае перажыванні ўзмацніліся на наступны дзень, калі патэлефанаваў муж і спытаў, ці ёсць у нас дома ёд. Аказваецца, падчас прагулкі на вуліцы малы зноў упаў — і скурка, якая ўтварылася на ўчарашніх ранках, бессаромна злезла. Крыві было! А слёз! На наступны дзень, нягледзячы на тое, што быў ён цёплы і сонечны, Цёмік пайшоў у садок у доўгіх штанах — паўтору «трагедыі» нам вельмі не хацелася. Калені, вядома, амаль ужо зажылі. І шорты Арцём, канешне, носіць. Затое мы цяпер яго сто разоў папярэджваем, каб не насіўся як вецер, каб быў асцярожны. Быццам самі і не былі дзецьмі...

Пра мужа і брата маўчу — у дзяцінстве хлопцам усяго хапіла: не тое што пабітых каленяў, а нават зламаных рук і сур'ёзных апёкаў. А вось як магла трапіць ва ўсялякія сітуацыі я, абсалютна паслухмяная і спакойная дзяўчынка?! Летам ногі і рукі пастаянна былі то ў сіняках, то ў драпінах. Аднойчы ехалі з сяброўкай на веласіпедах, і я загледзелася на шыкоўную машыну, якая ў нашай вёсцы была рэдкасцю, — у выніку ўпала, моцна падрапаўшы нагу аб бардзюр. Сяброўка мая (дарэчы, і цяпер мы разам), малайчына, не разгубілася: знайшла нейкі кавалак бінту (сучасныя дзеці наўрад ці такое з сабой возяць) і заматала ім рану, папярэдне прыклаўшы да яе лісцік трыпутніка — ранейшыя дзеці «лячыліся» менавіта так. Пра надзвычайнае здарэнне я, вядома, бацькам сказаць пабаялася. Мама, праўда, увечары, калі я мылася, убачыла ўсё сама — вялізны рубец на левай назе складана было не заўважыць, як я ні хавала. Па-добраму яго трэба было зашыць у бальніцы, бо напамін аб той падзеі «ўпрыгожвае» маю нагу і сёння.

Як і шнар на шчацэ. Гэта сіямскі кот маёй стрыечнай сястры паклапаціўся. Мне было гадоў восем, калі ў садзе бабулі і дзядулі я, седзячы на плоце, няўдала ўзяла ката за адну лапу — другой ён мяне паласнуў па шчацэ. Акрываўлены быў увесь твар. Бабуля (і сёння здзіўляюся яе спакою) апрацавала рану спіртам і загадала спакойна лячыць і чакаць вечара, калі бацькі дакапаюць бульбу. Яна, разумная жанчына, добра ўсведамляла: калі сказаць ім аб маім «раненні» цяпер, работа спыніцца. А гэтага па тым часе, а тым больш у вёсцы, калі задзейнічана тэхніка і людзі, дапусціць было нельга. У выніку ў бальніцу, хоць і ноччу, мы ўсё ж такі паехалі — мясцовы фельчар сказала, што, калі тэрмінова не зашыць рану, рубец застанецца на ўсё жыццё. І ён застаўся — відаць, бульбу трэба было пакінуць на заўтра.

Ужо будучы падлеткам, я пераклуліла на сваю нагу каструлю з кіпенем. Успамінаю і адчуваю той боль, з якім цяжка было справіцца. Не дапамагала ні халодная вада, ні лёд, ні ўсялякія народныя сродкі. Памятаю, як паўлета бацька вазіў мяне на веласіпедзе ў фельчарска-акушэрскі пункт, дзе мне рабілі перавязкі, як я ў спёку хадзіла ў шкарпэтках, каб не пашкодзіць сваю рану. Таму я, як ніхто, ведала, што адчуваў мой сын, калі ў годзік вывернуў на сябе кубак з гарачай гарбатай. Быццам вар'ятка, я з галавой трымала яго пад халодным душам, а потым дзьмула на месца апёку, калі ў машыне хуткай дапамогі мы ехалі ў бальніцу. У такіх сітуацыях нават самыя сучасныя і смелыя маці становяцца безабароннымі.

Вось і аберагаеш сваё дзіця ад падобных непрыемнасцяў, бо на ўласным вопыце ведаеш, як гэта балюча, а часам і страшна. І хоць кажуць, што вучацца на ўласным вопыце, на сваіх памылках, аднак калі гэта датычыцца тваіх дзяцей, гэтых самых памылак адэкватныя бацькі дапусціць не могуць. Вось і трасуцца над сваімі малымі, у соты раз папярэджваюць глядзець пад ногі альбо не бегаць хутка, каб хоць калені былі цэлыя...

Вераніка КАНЮТА.

Сямейная газета

Выпуск № 11 (170)

Тыя, хто побач

«ДЗЯКУЮЧЫ ДЗІЦЯЦІ Я СТАЛА БОЛЬШ ПАСПЯВАЦЬ»

Вікторыя ЛАЗІЦКАЯ:

У далікатнай маладой жанчыне, якая ішла побач з высокім хлопцам, які каціў каляску з чароўнай малечай, я так і не пазнала вакалістку гурта «БайСіці» Вікторыю Лазіцкую. Яна сама да мяне падышла. Ох ужо гэты сцэнічны макіяж — мяняе чалавека да непазнавальнасці, нібы выбудоўвае ахову паміж артыстам і публікай. А на прагулцы з мужам і дачкой Вікторыя выглядала вельмі міла, неяк па-хатняму і ў той жа час дагледжана. Тэма размовы была акрэслена загадзя — сямейнае жыццё. Мы прыселі на лаўку ў парку, каб пагаварыць, а муж артысткі шпацыраваў непадалёк з каляскай. У нейкі момант і ён паўдзельнічаў у інтэрв'ю.

— Як вы пазнаёміліся з мужам?

Вікторыя: — Як бы банальна ні гучала, але пазнаёміліся мы на адпачынку ў Егіпце. Было гэта яшчэ ў даковідныя часы. У нас у калектыве традыцыя: пасля шматлікіх канцэртаў і карпаратываў добра адпачыць. А тады мы вырашылі пагрэцца і паляцелі ў цёплую краіну. Мой будучы муж у гэты ж дзень паляцеў на адпачынак са сваімі сябрамі. Сустрэліся вечарам у рэстаране, аднак першым нас з дзяўчатамі заўважыў сябар мужа. Праходзячы міма нашага століка, ненадакучліва адарыў нас камплімentамі, пазнаёміўся, і ў выніку ўсе хлопцы далучыліся да нашай дзявочай кампаніі. Мы міла размаўлялі ў той вечар, а маё знаёмства з Антонам працягвалася і далей.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

І мы там былі

Крылы феі, палімерны «чарвяк» і кёрлінг на ламінаце

Што рабілі дзеці і бацькі на сямейным фестывалі «Букідс»

Паспрабаваць сябе ў 58 прафесіях, уласнымі рукамі зрабіць гліняны магніцік, распісаць узорамі пернік ці будаўнічую каску, зваляць цацку з лямцу, паставіць хімічны дослед, нанесці макіяж, навучыцца жангліраваць, паўдзельнічаць у раскопках... Гэта і мноства іншага два дні рабілі дзеці на сямейным фестывалі «Букідс. Прафесіі» ў сталічным Батанічным садзе. Дадайце сюды магчымасць самастойна зарабіць мясцовую валюту — букідсы, паўдзельнічаць у спектаклях, праверыць сябе на спрытнасць і кемлівасць у віктарынах, лоўлі мыльных бурбалак і карасканні па «гарах». Атрымаецца поўнае сюрпрызаў месца для адпачынку з бацькамі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

Крылы феі, палімерны «чарвяк» і кёрлінг на ламінаце

Барыста, зваршчык, кветкавод...

Набыўшы «працоўную кніжку», малыя адразу кідаліся шукаць першае месца працы і заўзята спрабавалі паўтарыць усё, што ім паказвалі і расказвалі пра пэўную прафесію. Бацькі ж з веданнем справы глядзелі, куды ўладкаваць дзіця наступным разам. А заняцца тут было чым. Хочаш — ідзі ў аўтамайстэрню і станавіся прадаўцом ці канструктарам аўтамабіляў. Або ўладкоўвайся на аўтазапраўку апаратарам АЗС. Ці стварай уласны смак, стаўшы барыста або чайным самелье.

Многія прафесіі пераносілі дзяцей у віртуальную рэальнасць, як, напрыклад, віртуальны зваршчык: праз спецыяльную маску малыя назіралі, як яны самі нібыта сапраўды робяць металічнае шоу. А тыя, хто вырашыў стаць мультыплікатарам, пабачылі на маніторы ўласна «зняты» мульцік.

— Мы стараліся, каб атрымалася свята для ўсёй сям'і, дзе было б цікава і дарослым, і дзецям. Для малых гэта пэўны адукацыйны момант, а дарослых стараліся здзіўляць арганізацыяй пляцовак. Мне падабаецца дарыць добрыя эмоцыі, — абазначыла мэты **Таццяна ЮЗАФОВІЧ, арганізатар фестывалю «Букідс».** — Па маштабе мы сталі большымі, і гасцей значна павялічылася. Толькі за першы дзень выдалі 4,5 тысячы працоўных кніжак, а прылічыце яшчэ бацькоў... Нават прафесій напачатку было заяўлена 58, але на некаторых лакацыях знаходзілася па некалькі спецыяльнасцяў, так што ў выніку атрымалася 82.

Юныя садаводы высаджвалі ў агародзе, што стварыла кампанія дзіцячага харчавання Bambolina, расаду перцаў ды памідораў, а кветкаводы ладзілі прыгожую кампазіцыю, якая застанецца квітнець у батанічным садзе. Мадэлі вучыліся дэфіліраваць па подыуме, а візажысты асвойвалі навуку макіяжу.

— Мы хацелі, каб наша дачка паспрабавала розныя прафесіі і, магчыма, у далейшым вызначылася, што ёй больш па душы. А можа, і нейкія таленты раскрыюцца, — падзялілася ўражаннямі Вераніка, якая разам з дачкой Дамінікай і мужам прыйшла на фестываль.

На некалькі хвілін можна было адчуць сябе артыстам, цік-токерам, акцёрам ці журналістам. Выдаўцы рабілі кнігі, стаматолагі чысцілі зубы беламу мядзведзю, медыкі ставілі кропельніцы, акварэлісты малявалі нацюрморты. Артысты Белдзяржцырка вучылі рабіць з шарыкаў фігуркі, жанглiраваць, круціць абруч — да апошніх двух заняткаў з захапленнем далучаліся і мамы.

Кёрлінгісты накіроўвалі да мішэняў камяні па ламінаце. Мішка Барні зладзіў для юных палеантолагаў майстар-клас па лепцы дыназаўраў з гліны, а таксама раскопкі «костак дыназаўраў» у пясочніцы — тут вам і заробак букідсаў, і проста задавальненне.

Сустракаліся і незвычайныя прапановы, напрыклад пераўтварыцца ў фею і змайстраваць сабе папяровыя крылцы.

Энергетычныя, салодкія і творчыя бонусы

Іх можна было атрымаць, зарабляючы грошы на фестывалі. На пляцоўцы з атамнымі прафесіямі — капітанам атамнага ледакола, аператарам блочнага пульта кіравання атамнай станцыі, будаўніком атамнага аб'екта і іншымі — можна было, напрыклад, зарадзіць мабільны «экалагічна чыстай энергіяй».

А распісаныя падчас работы кандытарам пернікі — забраць з сабою і падсілкавацца, гэтаксама як і гарбатай, якую гатавалі маленькія самелье. Увогуле, усе вырабы, створаныя маленькімі работнікамі, можна было захапіць з сабою на памяць аб незвычайных «працоўных днях».

— У мяне дзеткі рабілі цацкі з нарыхтовак англійскага велюру: магніцікі, брошкі, бірулькі, ляльку ў ручку, бо наш майстар-клас скіраваны на самых маленькіх, — расказала **майстар Алеся.** — Дзіця з любымі навыкамі можа сшыць дэталі, і не будзе заўважна, як яно гэта зрабіла, бо любое шво схаваецца ў ворс тканіны, што зручна.

На майстар-класе па роспісе імбірных пернікаў дзеці з задавальненнем працавалі з салодкімі колерамі.

— Спачатку было 115 вялікіх пернікаў: коцікі, зайчыкі, сэрцайкі, кветачкі, але іх дзеці вельмі хутка распісалі. Думаю, і 500 бы пайшлі, — упэўнена майстар Алена, якая і гатуе смакату, і вучыць яе распісваць. — Цяпер толькі маленькія засталіся — але і іх толькі паспяваю даставаць.

А на іншай пляцоўцы малыя траплялі ў сапраўдную лабараторыю з прабіркамі, колбамі і каляровымі «хімікатамі», дзе стваралі палімернага «чарвяка».

— Наш «чарвяк» робіцца з раствору альгінату натрыю. Падобным чынам робяць і штучную ікру. «Чарвяк» таксама ядомы, але я спецыяльна дадала падчас эксперымента ў яго блёсткі, каб дзеці ведалі, што пасля лабараторных доследаў нельга нічога з гэтага ні есці, ні піць, — падкрэсліла **Вікторыя, кіраўнік клуба «Малекула».**

Дзіцячы маркет і другое жыццё рэчаў

Хоць работа на фестывалі і цікавая, але ж і ад яе трэба адпачываць, каб не думаць увесь час, куды яшчэ бегчы зарабляць букідсы. Замест гэтага можна было адправіцца ў «Тэатр пад дрэвам», каб паглядзець спектакль і нават крыху ў ім паўдзельнічаць. Залезці ў кабіну міні-экскаватара і пасігналіць. Паваляцца ў пясочніцы з гарохам. Сабраць з канструктара машыну — на гэтай пляцоўцы таты хіба не з большым захапленнем, чым дзеці, скручвалі гайкамі дэталі. Для актыўнага адпачынку былі батуты, скалалазанне, паласа вяровачных перашкод, заняткі ёгай. Можна было зрабіць аквагрым ці згуляць у шахматы і, вядома, запісацца на заняткі ў любую з секцый, якія былі прадстаўлены на свяце.

Некаторыя юныя ўдзельнікі «Букідса» зарабляли сапраўдныя грошы, бо гандлявалі на Дзіцячым маркеце — спецыяльнай пляцоўцы для юных бізнесменаў. Прайсці міма было складана, чуючы заклікі «Кнігі па рублі — дарма бяры!», «Зніжкі на ўсё!».

— Мама сказала, што будзе такі фестываль, і я адразу захацела ўдзельнічаць, — кажа Кіра. — У мяне былі бранзалеткі, міні-размалёўкі, варажылкі, лінейкі з паперы. Большасць рэчаў я зрабіла сама, нешта купіла, а кнігі мне для продажу даў тата.

Яе суседка па маркеце Ксюша гандлявала мяккімі цацкамі і ўласна зробленымі вырабамі-свечкамі два дні.

— Я зрабіла піньяту з цукеркамі. Цацкі свае прадаю тыя, якія мне ўжо не патрэбны. Але большасць засталася ўсё ж дома, — смяецца яна. — А яшчэ ў мяне бяспройгрышная латарэя.

Нестандартным і карысным для мам стаў абмен дзіцячымі рэчамі і цацкамі на пляцоўцы «KIDS FREE MARKET». Гэта ініцыятыва дзвюх мам, якія такім чынам даюць непатрэбным рэчам шанс на другое жыццё.

Заробкі і пакупкі

На першы погляд здаецца, што, каб пазнаёміцца з прафесіяй, на свяце дастаткова некалькі хвілін, але гэта не так. Колькі ні спяшайся, каб атрымаць букідсы, лакацый і заданняў процьма. Кажуць, што шмат букідсаў (600 і больш) удалося зарабіць тым, хто прыйшоў у першы дзень з самага ранку. Яны ж і набылі за іх найлепшыя падарункі — мальберты. А з-за вялікай колькасці наведвальнікаў валанцёры проста з ног збіваліся.

— Валанцёры прыходзяць а сёмай раніцы і працуюць да дзевяці вечара ў рэжыме нон-стоп. Перапынак толькі на абед, таму ім цяжкавата, — прыадкрыў таямніцу работы альтруістаў **Яўген МАРЭЦКІ, кіраўнік адной з дзесяці каманд валанцёраў,** якія працавалі на фестывалі.

— Адукацыйны момант як першапачатковая мэта фестывалю — гэта добра, аднак з улікам такога масавага сумбуру задача са знаёмства і атрымання нейкага ўяўлення аб прафесіях на пляцоўках ператварылася ў гонку за букідсамі, якія пасля трэба абмяняць на падарункі, — заўважыла мама Вольга.

Іншыя мамы прапанавалі арганізатарам пры абмене букідсаў на падарункі арганізаваць маленькае бліц-апытанне для дзяцей накшталт: што табе спадабалася, чаму ты навучыўся, што карыснае ты атрымаў ад сённяшняга дня?

Самі ж малыя ў цэлым засталіся задаволенымі і з радасцю дзяліліся ўражаннямі з бацькамі і светам.

Ірына СІДАРОК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

«Я БОЛЬШ ТАК НЕ БУДУ!..»

ПРЫЧЫНА ШКОДНЫХ ЗВЫЧАК У ДЗЯЦЕЙ

Непрыгожа і негігіенічна — так можна ахарактарызаваць звычку дзяцей грызці пазногці або лезці пальцам у нос. Бацькі, заўважыўшы дзіця за падобнымі дзеяннямі, могуць пачаць лаяцца на яго. Спецыялісты лічаць, што такая рэакцыя дарослых можа якраз, наадварот, прывесці да замацавання хваравітых звычак. Дык што ж рабіць, як дапамагчы малому пазбавіцца ад непрымальных паводзін, разбіраліся з псіхолагам Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей Вольгай ВАРАНЬКО.

— Шкодныя звычкі ў дзяцей — гэта група спецыфічных парушэнняў паводзін, — тлумачыць псіхолаг. — У аснове іх ляжыць фіксацыя адвольных дзеянняў, якія ўласцівы дзецям. Напрыклад, некаторыя дзеці перабіраюць свае валасы, як бы накручваючы іх на пальчык, іншыя смокчуць палец. Таксама можа стаць звычкай дзіцячы ананізм. Звычайна бацькі звяртаюцца да псіхолагаў, калі пачынаюцца праблемы ў школе ці дзіцячым садку. У працэсе кансультацый высвятляецца, што малы мае якую-небудзь шкодную звычку.

— Ці могуць такія звычкі быць небяспечнымі для здароўя і развіцця дзіцяці або гэта проста непрыемныя дзеянні, якія насамрэч бясшкодныя?

— На іх у любым выпадку трэба звяртаць увагу, але рабіць гэта правільна. Небяспека — у прычыне. Чаму дзіця грызе пазногці, смокча палец або ўвесь час нешта шукае ў носе? Калі мы не ўдзяляем такім паводзінам увагі, звычка можа перарасці ў неўроз дакучлівых станаў. Гэта паўтарэнне рухаў, ад якіх потым складана пазбавіцца, і, магчыма, дзіцяці будзе неабходна ўрачэбная дапамога. Акрамя таго, узаемадзеянні дзіцяці са сваім целам могуць пашкодзіць фізічна, напрыклад, ёсць выпадкі калі малыя грызуць пазногці аж да ран, могуць нават пашкодзіць сасуды.

«Дрэнная звычка — гэта сімптом, што ў сям'і нешта пайшло не так і, магчыма, прыйшоў час прыгледзецца і палепшыць атмасферу ў доме».

— Але ж гэта ўжо псіхіятрычны дыягназ...

— Так, такое «прыклейванне» да рухаў можа перарасці ў захворванне. Цяжка сказаць, наколькі доўга лечацца такія паталогіі, усё залежыць ад ступені запушчанасці, у такіх выпадках звычайна неабходна ўжо медыкаментознае лячэнне. Але калі своечасова звярнуцца да спецыяліста, хоць бы да псіхолага, то можна ліквідаваць прычыну і пазбегнуць сур'ёзных хвароб.

— Як правільна адвучыць дзіця ад шкодных звычак?

— Па-першае абсалютна спакойна рэагаваць на іх. Любыя пакаранні, абрыванне, лаянка толькі фіксуюць дзіця на гэтых дзеяннях яшчэ больш. Агульная рэкамендацыя для падобных праяў — шукаць крыніцу напружання. Часцей за ўсё крыніцай з'яўляюцца самі бацькі, іх узаемаадносіны, увогуле атмасфера, у якой расце дзіця... Трэба ўлічваць не толькі псіхалагічны фактар, але фізіялагічны. Дзіця можа трымаць палец у носе, таму што ў яго парушылася праходнасць паветра ці ў зусім малых гэта можа быць проста пазнавальная актыўнасць. Што датычыцца псіхалагічных момантаў, то гэта хутчэй прыкмета таго, што дзіця пазбаўляецца такім чынам ад трывогі, таксама гэта можа быць прыкметай наяўнасці нейкіх страхаў. У такія моманты можна паспрабаваць проста пераключыць увагу дзіцяці. Але важна зрабіць гэта правільна, каб у малога не сфарміравалася сувязь: у такіх выпадках мама мяне заўважае! Пераключаць трэба на падсвядомым узроўні, напрыклад, фразамі: «Падай мне кубачак», «Паглядзі, якая ў мяне цацка!».

Важна дзіця вучыць жэстыкуляцыі падчас размовы, каб рукі былі задзейнічаны. Ёсць вельмі шмат гульнявых практыкаванняў для развіцця дробнай маторыкі. Гэта дапаможа дзіцяці рэалізаваць сваю пазнавальную актыўнасць. Неабходна вельмі тактоўна і ў спакойнай атмасферы казаць пра гігіену, пра тое, як выкарыстоўваць насоўкі, і такім чынам замяняць шкодную звычку на карысную. Што датычыцца пазногцяў, то тут праблема больш складаная. Лічыцца, што, грызучы пазногці, дзіця «грызе» сябе знутры. З аднаго боку, звычка дае некаторае заспакаенне, з іншага — у ёй ёсць і агрэсіўнасць. Прычынай можа быць інтэлектуальная перагружанасць дзіцяці, калі, апроч школы, малы дадаткова займаецца французскім, англійскім, шахматамі і іншым. У такіх выпадках бацькам варта падумаць пра тое, каб крыху разгрузіць малых.

Яшчэ адной прычынай перанапружання могуць быць гульні ў гаджэтах. Справа ў тым, што напружанне падчас такіх гульняў вельмі высокае. Я разумею, што выключыць з жыцця дзіцяці планшэты і смартфоны практычна нерэальна ў сучасным свеце, але выбудаваць пэўны рэжым і абмежаванне бацькам цалкам пад сілу.

Гэтак жа карысна вывесці шкодную звычку з несвядомага ў свядомае: распавесці дзіцяці, што з ім адбываецца, і прапанаваць вылучаць час на гэтую звычку ці падумаць разам, што яму дапаможа пазбавіцца ад напружання. Напрыклад, прапанаваць... грызці пазногці па вечарах з 19.00 да 19.15. Пры гэтым вы кантралюеце, каб дзіця не пагрызла пальцы да ранак і ні ў якім разе не сварыцеся з ім. Такім чынам дзіця малое быццам бы само бярэ кантроль над сваёй звычкай.

Вядома, важныя і клопат, і ласка, і ўвага, якія дапамогуць зняць напружанне. Магчыма варта пачаць рабіць дзіцяці расслабляльныя масажы, гуляць з ім у гульні пасля вяртання адчування свайго цела. Напрыклад, вы праводзіце пёркам па целе дзіцяці, а яно адгадвае, па якой частцы цела правялі прадметам. Падобных гульняў на расслабленне і адчуванне цела прыдумана вельмі шмат, і бацькі могуць падабраць, што больш падабаецца іх малому. Можа дапамагчы справіцца з гэтай праблемай і вяртанне дзіцяці пачуцця бяспекі: уладкуйце ў пакоі «домік» ці ўтульны куточак, дзе вы будзеце чытаць яму любімыя казкі або проста балбатаць. Некаторым дзецям дапамагаюць расслабіцца і скінуць напружанне актыўныя гульні, напрыклад бой падушкамі, танцы ці гульні з мячом.

— Мы зараз разважалі пра тое, як дзіцяці пазбавіцца ад шкоднай звычкі дома. А калі гэтая звычка стала праблемай у школе?

— Вядома, праява шкодных звычак не абмяжоўваецца домам. Канфузы могуць здарыцца ў любым грамадскім месцы ці ў школе, калі бацькоў няма побач. У такіх выпадках я прапаноўваю ўсё гэтак жа прама пагаварыць з дзіцем аб тым, што з ім адбываецца, і расслумачыць, што, акрамя шкоды, гэта яшчэ і непрыгожа. І разам паспрабаваць знайсці іншы спосаб зняцця напружання ў грамадскіх месцах. Напрыклад, сёння на рынку дастаткова шмат цацак-антыстрэсаў, якія дапамогуць малому заняць рукі. Калі ж падчас урока ён заўважыў за сабой жаданне, напрыклад, пагрызці пазногці, то можна выйсці з класа і схадзіць апаласнуць твар вадой. Можна паспрабаваць закрэсліваць квадрацікі на лісточку ў клетачку ці прапанаваць дзіцяці прыемную замену: пагрызці арэшкі, сухафрукты або сушкі.

— А што рабіць з такой далікатнай праблемай, як дзіцячы ананізм? Наколькі небяспечная звычка, якую многія замоўчваюць?

— На самай справе небяспечная для дзіцяці толькі рэакцыя бацькоў на іх маніпуляцыі з целам. Наогул, праблема дзіцячага ананізму ўласцівая толькі да сямі гадоў, у перыядным узросце звычайна ўключаюцца зусім іншыя механізмы, звязаныя з фізіялагічным развіццём. У дзяцей да двух гадоў можа быць звычайная прыродная цікаўнасць да свайго цела. Малыя проста па прычыне ўзросту могуць не ведаць, што ў іх ёсць нейкія «забароненыя» часткі цела, якія кранаць нельга. З іншага боку, дзіця можа такім чынам здымаць напружанне, кампенсаваць адзіноту, некаторыя спецыялісты ўвогуле вылучаюць адной з прычын дзіцячага ананізму прымусовае кармленне. Гэта звязана з тым, што даступнае задавальненне — ежа — не прыносіць радасці. Турбавацца тут варта бацькам, у якіх дзіця на фоне такой звычкі стала плаксівае, капрызнае і дрэнна спіць... Праблема можа паўстаць ад таго, што некаторыя малыя могуць займацца «гэтым» прылюдна. Але звычайна дзіця падсвядома падчас «працэсу» адасабляецца. Калі ж малое страчвае кантроль над сваімі жаданнямі, тады варта падумаць пра зварот да ўрача-псіхатэрапеўта.

«Выключыць з жыцця дзіцяці планшэты і смартфоны практычна нерэальна ў сучасным свеце, але выбудаваць пэўны рэжым і абмежаванне бацькам цалкам пад сілу».

— Вы сказалі, што звычка можа быць выклікана адзінотай дзіцяці. Што вы мелі на ўвазе і як дапамагчы малому ў такім выпадку?

— Прычынай можа быць унутранае адчуванне дзіцем пакінутасці і недалюбленасці, адсутнасць шчырасці і даверу паміж бацькамі. Каб дапамагчы справіцца з гэтым адчуваннем, трэба развіваць у дзіцяці эмацыянальны інтэлект, вучыць яго выказваць свае пачуцці славесна і эмацыянальна. Перад сном можна, каб пераключыць увагу, паспрабаваць прапанаваць яму класці ручкі пад падушку або даць у рукі цацку, якую ён будзе абдымаць, і быць побач, пакуль ён засынае.

Ва ўсіх сітуацыях са шкоднымі звычкамі ў дзяцей бацькам трэба разумець: дрэнная звычка — гэта сімптом, што ў сям'і нешта пайшло не так і, магчыма, прыйшоў час прыгледзецца і палепшыць атмасферу ў доме. Тады падобныя непрыемныя рэчы знікнуць і не будуць прыносіць дыскамфорту ні бацькам, ні дзецям.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ДАРОГА ДА МІРУ Ў ДУШЫ

Чым паломніцтва адрозніваецца ад турызму?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЛЕТА ва ўяўленні сучаснага чалавека непарыўна звязана з паездкамі і падарожжамі. Але калі ў звычайнае падарожжа падчас адпачынку мы адпраўляемся для аднаўлення фізічных сіл, то паломніцтва — гэта дарога, закліканая аднавіць нашы духоўныя сілы. Паломніцтва — натуральная патрэба чалавечай душы, са спрадвечных часоў яно ёсць ва ўсіх народаў і ва ўсіх рэлігіях.

Жыровіцкі манастыр.

— Галоўнае адрозненне паломніцтва ад турызму — тыя мэты, якія ставіць перад сабой чалавек, — кажа настаяцель прыхода храма Святіцеля Спірыдона Трыміфунцкага ў Мінску святар Аляксандр ПАЛЬЧЭЎСКІ. — Мэта паломніцтва — дотык да духоўнай рэальнасці праз фізічнае, канкрэтнае месца. Напрыклад, праз святыні, помнікі царкоўнай архітэктуры або месцы, якія згадваюцца ў Свяшчэнным Пісанні і гісторыі Царквы. Нядаўна ў нас было Евангельскае чытанне — апавяданне пра тое, як Ісус Хрыстос сустрэўся з жанчынай-самаранкай каля калодзежа Іакава. То-бок каля таго калодзежа, які пабудаваў яшчэ старазапаветны патрыярх Іакаў. Гэты калодзеж захаваўся да часоў, калі Гасподзь жыў на Зямлі, і, больш за тое, ён захаваўся да нашых дзён. Размешчана святыня недалёка ад Іерусаліма, у старажытным горадзе Сіхар (цяпер горад Наблус на заходнім беразе ракі Іардан, у Палесцінскай аўтаноміі). На працягу многіх стагоддзяў такія паважаныя паломнікамі месцы захоўваюцца і ўяўляюць велізарную духоўную каштоўнасць.

Будслаўскі касцёл.

ЧАЛАВЕК — ГЭТА ЯШЧЭ І ПЛОЦЬ

Здавалася б, навошта адпраўляцца ў доўгі шлях да святыняў у эпоху інтэрнэту? Адказ просты. Чалавек — не толькі душа, гэта яшчэ і плоць. Святыні сілкуюць душэўна-цялесныя пачуцці — зрок, слых, дотык. Датыкаючыся да святыні, паломнік таксама асвячае і сваю плоць, настройваецца на духоўны лад, узбагачаючыся ўзнёслымі ўражаннямі. Таму паломніцтва (як і пост) — найважнейшы спосаб яднання цялеснага і духоўнага складнікаў чалавека, сцвярджае царква.

— Старажытная традыцыя паломніцтва ў сучасным свеце не страціла значэння, — кажа айцец Аляксандр. — Многія людзі імкнуцца да святых месцаў, каб унутрана дакрануцца да Божай благадаці, адчуць свет у душы праз далучэнне да святыні. У сучасным рытме жыцця гэта зрабіць складана.

— Да святых месцаў людзі адпраўляюцца з рознымі мэтамі. Вылечыцца, папрасіць дапамогі ў жыццёвых справах або здароўя блізкім. Гэта правільна? Або любыя жыццёвыя мэты тут непрымальныя?

— Вядома, гэта правільна. Хоць першараднымі, зразумела, павінны быць духоўныя мэты. Але і простыя жыццёвыя просьбы таксама могуць быць дадатковай матывацыяй да паломніцтва. Многія людзі адпраўляюцца да святых месцаў, ставячы перад сабой мэту змяніцца як духоўна, так і фізічна — атрымаць благаслаўленне, вылячэнне або падтрымку. І часта атрымліваюць, ёсць такія выпадкі і ў нашы дні. Але, паўтаруся, паломнік галоўнай мэтай павінен лічыць імкненне наблізіцца да Бога, і Бог, бачачы жаданне чалавека, дапамагае яму на гэтым шляху.

ХТО ТАКІ ПАЛОМНІК

Паломнікам можа стаць любы хрысціянін. Важна толькі, каб ён быў у стане фізічна пераадолець тыя адлегласці, якія прадугледжвае паломніцтва. Але самае галоўнае пытанне, на якое павінен знайсці ў сваёй душы адказ чалавек, выпраўляючыся ў паломніцтва: навошта ён гэта робіць? Куды вядзе гэты шлях асабіста яго? Што ён хоча знайсці? Ці толькі дакрануцца да царкоўнай культуры і ўбачыць славутасці? Гэта ж не зусім паломніцтва — гэта турызм. Правільная мэта для паломніка — папрацаваць дзеля Бога, для духоўнага росту. Менавіта з усведамлення гэтай простай ісціны варта пачынаць свой шлях да святыні. Бо паломніцтва — не спосаб вырашэння асабістых праблем і не турыстычная паездка. Адпачыць і развеяцца у такой паездцы наўрад ці атрымаецца. І яшчэ адна важная ісціна: у паломніцтва можа адправіцца кожны, але паломніцтва — не для кожнага. Калі прайсці міма гэтай значнай ісціны, можа атрымацца, што вы пабывалі ў храмах і манастырах, але па-сапраўднаму нічога там так і не ўбачылі...

— Наколькі важна тое, што сучасны чалавек наўрад ці перажывае сур'ёзныя нястачы і цяжкасці на шляху да святыняў, як гэта было стагоддзі таму?

— Паломніцтва ў тым класічным сэнсе, якім яно было некалькі стагоддзяў таму, калі гэта сапраўды быў вялікі подзвіг і людзі маглі пешшу пераадольваць велізарныя адлегласці, а іх шлях доўжыўся некалькі месяцаў, наўрад ці магчыма ў нашы дні. Але ў кожным стагоддзі вернікі сутыкаюцца са сваімі цяжкасцямі. Так, сёння мы маем магчымасць з камфортам дабрацца да святыні. Разам з тым для сучаснага чалавека знайсці час і магчымасць, вырваць сябе з мітусні і клопатаў, аддаць асабісты час на тое, каб адправіцца ў паломніцтва, — таксама свайго роду духоўны подзвіг.

АБ ЦЯЖКАСЦЯХ ШЛЯХУ

Не варта ўспрымаць паломніцтва як дарогу да нейкіх выгод, якія можна папрасіць, прыбыўшы ў святое месца, і абавязкова атрымаць. Імкнучыся да матэрыяльных выгод, можна не заўважыць значна большага дару, які здабывае чалавек, дакрануўшыся да святыняў. Пазбавіўшыся раздражняльнасці, мітусні, зайздрасці, эгаізму, мы здабудзем гармонію і Бога ў душы. Наведаўшы манастыр або храм, куды вернік адпраўляецца ў паломніцтва, чалавек адчуе спакой і радасць. А вось наколькі камфортнай будзе дарога да святыні і колькі зорак будзе ў гасцініцы, у якой давядзецца жыць, — другарадна і, па сутнасці, да паломніцтва дачыненне не мае.

— Як паломніку варта рыхтавацца да свайго падарожжа?

— Вядома, важна духоўная падрыхтоўка, бо турызм і паломніцтва вельмі моцна адрозніваюцца. Напрыклад, арганізоўваючы паломніцтва, мне даводзілася сутыкацца з людзьмі, якія не заўсёды гатовы да нейкіх абмежаванняў, і для іх гэта сур'ёзнае выпрабаванне. Сучасны чалавек прывык да камфартабельных гасцініц, а калі мы едзем у нейкі манастыр, зразумела, умовы пражывання не будуць адпавядаць атэлям на курортах. Для тых, хто ўпершыню адпраўляецца ў паломніцтва, гэта добрая школа набожнасці і выхавання цярпення ў адносінах да людзей і абставін.

— То-бок цяжкасці і нястачы — і ў нашы дні непазбежная частка шляху паломніка да святыняў?

— Так, і лепш маральна падрыхтавацца да іх загадзя.

— А ці патрэбныя перад паломніцтвам пост, споведзь?

— Так, калі мы едзем у святое месца — храм або манастыр, дзе праводзяцца богаслужэнні, і калі мы хочам прыняць удзел у таінствах, плануецца і пост, і чытанне малітваў, і споведзь. Вельмі важна настроіцца ў дарозе — не слухаць музыку і не глядзець кіно, а пачытаць Святое Пісанне і малітвы.

Зразумела, перад дарогай трэба як мага больш даведацца аб святыні, куды вы адпраўляецеся — не з турыстычных даведнікаў, а з духоўных тэкстаў. Толькі тады ваша дарога стане сапраўдным паломніцтвам. Таму што паломнік павінен убачыць у першую чаргу не архітэктурныя помнікі і не прадметы мастацтва — хоць і гэта таксама. Побач са святыняй паломнік бачыць свае недахопы — і набывае сілу іх выправіць.

Святая зямля.

КУДЫ АДПРАВІЦЦА?

— У паломніцтва лепш ехаць аднаму або з групай?

— Можна адправіцца і аднаму. Але, вядома, калі едзе прыход, калі людзі адзін аднаго ведаюць ці знаёмяцца ў дарозе і праводзяць час разам, гэта духоўна настройвае кожнага і аб'ядноўвае.

Калі вы адчулі ў сваёй душы жаданне дакрануцца да святыняў, стаўшы паломнікам, спачатку варта пагутарыць са святаром і ўзяць благаслаўленне на паездку.

— Пры многіх храмах існуюць паломніцкія цэнтры, якія займаюцца арганізацыяй і правядзеннем такіх паездак, — кажа суразмоўнік. — Наш прыход таксама пастаянна праводзіць паломніцкія паездкі вернікаў як у межах Беларусі, так і ў Святую Зямлю, Грэцыю, Грузію.

— Сёння ў беларускіх падарожнікаў варыянтаў вельмі нямат. А куды вы параілі б адправіцца ў паломніцтва ў Беларусі гэтым летам?

— У нашай краіне ёсць выдатныя месцы — перш за ўсё гэта Жыровіцкі манастыр. У 2020 годзе споўнілася 550 гадоў з дня з'яўлення Жыровіцкай іконы і 500 гадоў з дня заснавання манастыра. Гэта найстаражытнейшы і найбуйнейшы манастыр на тэрыторыі Беларусі. Тут можна прыняць удзел у богаслужэнні, пагутарыць з манахамі, дакрануцца да духоўнай традыцыі праваслаўнай Царквы. Варта наведаць і Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр у Полацку, куды штогод прыязджае мноства паломнікаў. Гэта дзіўнае месца, я сам вельмі люблю там бываць і стараюся кожны год яго наведваць. А ў цэлым у кожнай епархіі, у кожнай вобласці Беларусі ёсць святыні, якія могуць быць мэтай паломніцтва.

— А калі казаць пра найбольш знакавыя для праваслаўя святыні, размешчаныя за мяжой?

— Для хрысціяніна дорага наведванне тых месцаў, якія ў першую чаргу звязаны з жыццём Збавіцеля (Святая Зямля, Іерусалім). А таксама месцы, звязаныя з жыццём Прасвятой Багародзіцы і святых. У праваслаўнай традыцыі паломнікі любяць наведваць Святую Зямлю і Святую гару Афон (але на Афоне могуць пабываць толькі мужчыны). Гэтыя месцы асабліва каштоўныя тым, што на працягу многіх стагоддзяў там захоўвалася і падтрымлівалася духоўнае жыццё. Манахі, старцы, падзвіжнікі дзеляцца сваім вопытам духоўнага жыцця з тымі, хто прыязджае да іх, удзельнічае ў богаслужэннях. Святыя месцы прыцягваюць да сябе вернікаў яшчэ і тым, што тут прысутнічаюць людзі, да якіх імкнуцца душы і сэрцы. Наш храм прысвечаны Спірыдону Трымфунцкаму, а яго нятленныя мошчы захоўваюцца на востраве Корфу — у адным з самых шанаваных у праваслаўным свеце месцаў паломніцтва. У Расіі вядомыя месцы паломніцтва — Троіца-Сергіева Лаўра і Оптына Пустынь. Наогул, праваслаўных святынь мноства, адшукаць іх можна нават у Сан-Францыска, дзе захоўваюцца мошчы святога Іаана Шанхайскага і Сан-Францыскага.

— У нашы дні ў сувязі з пандэміяй і іншымі звязанымі з перамяшчэннем праблемамі вы б параілі паломнікам не адмаўляцца ад жадання на свае вочы ўбачыць тыя ці іншыя святыні?

— Я думаю, калі ёсць магчымасць, ад паломніцтва адмаўляцца не варта. Наадварот, у складаныя перыяды жыцця, каб умацаваць веру і здабыць душэўны спакой, вельмі добра наведаць святое месца — для ўнутранага, духоўнага абнаўлення.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

«ДЗЯКУЮЧЫ ДЗІЦЯЦІ Я СТАЛА БОЛЬШ ПАСПЯВАЦЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— А далей — гэта колькі часу прайшло да вяселля?

В.: — Пасля прыезду дамоў мы сустракаліся паўтара месяца, а потым малады чалавек з'ехаў працаваць па кантракце за мяжу. Але ўвесь гэты час былі палкія стэлефаноўванні, зносіны ў сацсетках. Увосень Антон вярнуўся ў Мінск і за дзень да майго дня нараджэння зрабіў прапанову.

— Нярэдка адносіны, якія толькі пачынаюцца, адлегласць разбурае...

Антон: — У нас атрымалася наадварот: на адлегласці пераканаўся ў сваіх пачуццях да Вікі.

В.: — Добра, што мы жывём у век высокіх тэхналогій і можам карыстацца сучаснымі сродкамі сувязі.

— А як прайшло знаёмства з бацькамі?

В.: — Мае бацькі, калі ўбачылі Антона, сказалі, што яны быццам ведалі яго ўсё жыццё, вельмі хутка пачалі называць яго сынам. Я ні кроплі не хвалявалася за адносіны Антона і бацькоў, ён ім спадабаўся адразу, а маму проста скарыў сваімі бліскучымі кулінарнымі здольнасцямі. Пры гэтым бывае ж так, што мужчына выдатна гатуе, а вось прыбіранне на кухні пасля кулінарных эксперыментаў дастаецца жанчынам. Антон гатуе ў тым ліку складаныя стравы, і на кухні ў яго ідэальны парадак. У мяне таксама цёплыя адносіны з бацькамі мужа. Свякроў — мая другая мама, яна таксама называе мяне сваёй дачкой.

— Як спраўлялі вяселле, хто з артыстаў спяваў?

В.: — Так атрымалася, што на падрыхтоўку да вяселля ў нас было ўсяго тры тыдні. Фактычна ўсе клопаты па сцэнарыі, кульмінацыйнай праграме я ўзяла на сябе, бо перад маімі вачыма прайшло шмат розных урачыстасцяў. Хацелася пазбегнуць памылак, якія я заўважала ў іншых. Мне дапамагалі ўсе дзяўчаты з «БайСіці» і наш прадзюсар Уладзімір Іванавіч Бранкоўскі. На ўрачыстасць сабралася амаль сто чалавек! Прыехалі ўсе родныя і сябры, не абышлося без сваякоў з далёкіх краін. Музычная частка была аддадзена бэнду «Ячны солад», вядучым у нас быў Сяргей Еніхаў, а яго танцавальнае шоу таксама забаўляла гасцей. Было вельмі прыемна, што прыехала павіншаваць са шлюбам мая сяброўка Ірына Дарафеева, з песняй-віншаваннем з'явіўся Аляксей Хлястоў. Вядома, я крыху нервавалася падчас падрыхтоўкі, хоць мяне падтрымлівалі родныя і сябры. Сама ўрачыстасць прайшла нефармальна і прыгожа, як я і хацела.

— У гурта «БайСіці» нямала прыхільнікаў. Як вы, Антон, спраўляецеся з пачуццём рэўнасці?

А.: — Я давяраю Вікторы, таму раўнаваць неяк і не думаў. Калі няма даверу, то і не варта стварацъ сям'ю. Замест рэўнасці я захапляюся дасягненнямі сваёй жонкі, радуюся новым песням, кліпам і нават прыхільнікам *(смяецца)*. Хоць, трэба прызнаць, я вельмі раўнівы, якім і мусіць быць Леў па гараскопе.

— Якая песня ў выкананні гурта «БайСіці» ваша самая любімая?

А.: — Самая любімая — «Я за табой пайду». Упершыню я яе пачуў на вяселлі, калі жонка і ўдзельніцы гурта выконвалі яе разам з бэндам «Ячны солад». Памятаю, як у той момант, як кажуць, ляглі на сэрца тэкст і музыка, а яшчэ ж і Віка вельмі прыгожа спявала. Менавіта з таго моманту гэта мая любімая песня.

— Як змянілася ваша жыццё з нараджэннем дзіцяці?

В.: — Яно змянілася цалкам. Дзіця доўгачаканае і вельмі жаданае. Дзіця, якое прынесла шчасце ад мацярынства і ад бацькоўства. Вельмі хацелі першую дзяўчынку, так і атрымалася. Усё па-іншаму закруцілася. Нельга сказаць, што гэта цалкам перыяд ружовага шчасця, бо бываюць моманты, калі ты не ведаеш, як сябе паводзіць. Першыя тры месяцы малая нам зусім не давала спаць. Часам за ноч выпадала паспаць усяго толькі паўгадзіны. На шчасце, дапамагалі нашы бацькі. Потым усё нармалізавалася, і я ўжо задумвалася над тым, каб вярнуцца да работы. І, ведаеце, аказалася, што ўсё можна сумяшчаць, і пасля канцэртаў асабліва прыемна вяртацца дадому, дзе цябе чакаюць, а больш за ўсіх — дачушка.

Як гэта ні дзіўна, але дзякуючы дзіцяці я стала больш паспяваць. Пакуль не было Паліны, дазваляла сабе даўжэй паспаць, часам, можа, крыху нават ленавалася. Цяпер у мяне атрымліваецца не толькі планаваць свой дзень, але і ажыццяўляць задуманае.

А.: — Нягледзячы на тое, што былі цяжкія моманты, нам вельмі спадабаўся першы вопыт бацькоўства. І зараз мы ўжо задумаліся пра другое дзіця.



— Ці замацаваны за кожным з вас пэўныя хатнія абавязкі?

В.: — У нас у сям'і няма падзелу на жаночыя і мужчынскія хатнія справы. Нікалі нават не звярталіся да паслуг няні. Калі канцэрты — прыязджае мая свякроў. Я ёй вельмі ўдзячная. Яна выгадавала сына, які ўмее ўсё: прыбраць, прыгатаваць, але не вельмі патрэбнае, то цяпер значна больш сур'ёзна падыходжу да шопінгу. І пры гэтым не магу сказаць, што ў чымсьці сабе адмаўляю, проста, з аднаго боку, стала больш рацыянальнай, з іншага — я ж зараз не адна, і мне прыемна клапаціцца аб сваіх блізкіх. Мы стваряем, як жартам называем, «залаты фонд», які плануем выдаткаваць на будаўніцтва дома. Пры гэтым частка маіх даходаў застаецца выключна ў маім распараджэнні на ўсякія жаночыя радасці — масажы, SPA-працэдуры. Муж не супраць.

— Дзе і як ваша сям'я любіць адпачываць?

В.: — У цёплыя краіны, якія вельмі любім, пакуль яшчэ не выляталі, бо з маленькім дзіцем гэта вельмі хвалюючы. Ды і цяпер пандэмія, да якой мы сур'ёзна ставімся. У асноўным адпачывалі за горадам, да таго ж у Беларусі вельмі шмат цікавых і прыгожых месцаў. Часам бацькі застаюцца з Паліначкай, а нас адпускаюць на рамантычныя вячэры ў рэстараны.

— У беларускім шоубізнесе нямала сямейных пар. Ці ёсць такая, якой вы захапляецеся і чаму?

В.: — Класічны прыклад пары, якая глядзела ў адным кірунку, — Ірына Відава і Алег Молчан. У іх былі проста ўнікальныя адносіны: і партнёрства ў творчасці, і бясконцае захапленне адно адным. Калі не стала Алега Уладзіміравіча, Ірына зрабіла вельмі шмат для захавання памяці пра яго як пра выдатнага сучаснага кампазітара. Наша група заўсёды падтрымлівае Ірыну, калі трэба выступіць на мерапрыемствах памяці Алега Молчана, бо ён падарыў нам выдатныя песні. А яшчэ мне вельмі імпануе пара Вольгі Плотнікавай і Генадзя Маркевіча. Яны адзін аднаго выдатна дапаўняюць, у іх добра ўладкаваны побыт, выхаваныя дзеці, пры гэтым усё трапятліва і душэўна. Падабаецца іх пазітыўнае стаўленне да жыцця. Вольга для мяне — натхняльны прыклад таго, як удала сумяшчаць мацярынства і сцэну.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота з асабістага архіва Вікторыі ЛАЗІЦКАЙ.

Праспект Сяброўства

Яго намалявалі на агароджы, што ўздоўж дарогі на Рэчыцу насупраць конна-спартыўнай школы, вучні Азяршчынскай сярэдняй школы № 1 Рэчыцкага раёна. І гэта не проста маляўнічае графіці, а прапанова дапамагчы тым, хто пакутуе ад праяў булінгу, знак, што яны не адны. Праз карцінку аўтары хацелі праінфармаваць людзей, якія праходзяць міма, пра тое, як важна змагацца з цкаваннем і праявамі знявагі.

Работа школьнікаў — адзін з двух пераможцаў трэнінгу па тэхналогіі АПШЫФТ «Пошук рашэнняў для супрацьдзеяння булінгу ў школьным асяроддзі», які Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) рэалізаваў у партнёрстве з Інстытутам псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта.

— Згодна са статыстыкай, кожны другі падлетак сутыкаецца з цкаваннем і гвалтам у школьным асяроддзі. Вельмі важна, што менавіта самі школьнікі, падлеткі стваралі вырашэнне гэтай праблемы падчас праекта і ўвасаблялі ў жыццё свае ідэі, як супрацьстаяць булінгу. Калі мы абвяшчалі вынікі спаборніцтваў, якія праходзілі ў межах праекта «Сяброўскае і падтрымліваючае асяроддзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі», то абяцалі дапамагчы двум пераможцам рэалізаваць іх праекты, — нагадаў **Дзмітрый ШЫЛІН, старшы каардынатар па пытаннях аховы дзяцінства прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН у Беларусі.**

Ідэя азяршчынскіх навучэнцаў скарыла журы тым, што праект абазначае праблему булінгу праз выявы, у якія ўкладзены адпаведны сэнс. Да таго ж графіці — актуальная патрэба падлеткаў у самавыяўленні.

— Мы ўпэўнены, што наш праект «Графіці супраць булінгу, або Праспект Сяброўства» дапаможа людзям, якія будуць праязджаць міма малюнка, — выказаўся **Уладзімір ГРЫЦКОЎ, вучань 11 класа Азяршчынскай сярэдняй школы № 1,** удзельнік праекта. — Булінг цяпер ёсць бадай што ў кожным горадзе, школе, класе, і пра гэта трэба гаварыць.

Такога ж меркавання прытрымліваюцца і педагогі.

— Многія дзеці, адчуўшы на сабе нейкія элементы гвалту, дадаюць да яго нешта сваё і прыносяць гэта ў школу. Такім чынам яны намагаюцца паказаць свае перавагі над іншымі, — заўважыла **Таццяна ГАРДЗЕЙ, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Азяршчынскай сярэдняй школы № 1.**

— Вельмі важна атрымаць пазітыўны вопыт дыялогу і рашэння праблем, якія ўзнікаюць ва ўзаемаадносінах аднагодкаў, і прыйсці да сяброўскіх адносін, — падкрэсліла **Ала МУЗЫЧЭНКА, загадчык кафедры псіхалогіі адукацыі БДПУ імя М. Танка.**

Падчас стварэння работы ў графіцістаў была вялікая група падтрымкі. Школьнікі змаглі яшчэ раз абмеркаваць пытанні булінгу, падзяліцца сваімі думкамі і нават зладзіць невялікі музычны флэшмоб.

Ірына СІДАРОК.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Технолит Полоцк», 211408, Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101**

Оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101

№ лота	Инв. номер	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	1276	Вибролоток суточных бункеров	756,00	37,80
2	2337	Кокильный комплекс для производства отливок из чугуна	218 820,00	10 941,00
3	2338	Линия розлива кокильного литья	1 344,00	67,20
4	585	Машина формовочная	3 780,00	189,00
5	762	Смеситель центробежный	7 140,00	357,00
6	2333	Смеситель периодического действия	73 416,00	3 670,80
7	207	Поперечно-строгальный станок 7Д36	2 772,00	138,60
8	304	Станок вертикально-сверлильный 2А135	1 512,00	75,60
9	342	Станок вертикально-сверлильный 2С-132	1 848,00	92,40
10	358	Станок обдирочно-шлифовальный 3М634	277,20	13,86
11	385	Станок универсальный заточной 3Д642Е	1 848,00	92,40
12	392	Плоскошлифовальный станок ОШ 40-80	5 040,00	252,00
13	423	Станок круглопильный Ц6-2	2 688,00	134,40
14	432	Вальцы резинообрабатывающие ПД-320 160/160	4 200,00	210,00
15	468	Вертикально-сверлильный станок 2Н135	1 596,00	79,80
16	561	Пресс-ножницы (нест.)	3 276,00	163,80
17	798	Радиально-сверлильный станок 2К 52-2	3 948,00	197,40
18	822	Пресс кривошипный К2318А	2 436,00	121,80
19	999	Пресс кривошипный КД 2124Е	4 284,00	214,20
20	1107	Станок обдирочно-шлифовальный 3Б634	588,00	29,40
21	1136	Станок обдирочно-шлифовальный 3Б634	537,60	26,88
22	1138	Станок заточной универсальный 3В642	1 680,00	84,00
23	1143	Станок обдирочно-шлифовальный 3Б634	537,60	26,88
24	1201	Станок универсальный фрезерный 675П	2 520,00	126,00
25	1219	Ножницы листовые НД 3316Г	4 032,00	201,60
26	1220а	Полуавтомат зубофрезерный 5Е32	3 696,00	184,80
27	1238	Печь камерная СНО-7.6, 3.1/6-И1	1 764,00	88,20
28	1250	Электроталь Т10432 2 т	1 848,00	92,40
29	1296	Станок абразивно-отрезной	604,80	30,24
30	1368	Обдирочно-шлифовальный станок 3М636	1 260,00	63,00
31	1476а	Пресс гидравлический П-6326	4 032,00	201,60
32	1628	Окрасочный агрегат «Меркур» 030. 050	3 108,00	155,40
33	1718	Пылесос В19-101	1 344,00	67,20
34	1719	Пылесос В19-101	1 344,00	67,20
35	1730	Аппарат для воздушно-плазменной резки «Мультиплаз – 15000»	4 116,00	205,80
36	4740	Бесшумная ротационная компрессорная установка CSC-40/8 в сборе с осушителем	20 664,00	1 033,20
37	4780	Мойка высокого давления с фильтром для очистки воды Stihl RE 521	1 008,00	50,40
38	1920	ПерфобиндерCobbind C 20	109,20	5,46
39	1972а	Станок горизонтально-фрезерный	1 848,00	92,40
40	2247	Станок радиально-сверлильный 2К 52-1	3 612,00	180,60
41	2269	Станок настольно-сверлильный 2М112	428,40	21,42
42	2341	Станок радиально-сверлильный 2К 52-1	3 612,00	180,60
43	2531	Станок вертикально-сверлильный 2Н135	1 680,00	84,00
44	2546	Станок универсально-заточной 3Д642	3 108,00	155,40
45	2651	Пылеотсос ПА 218Б	840,00	42,00
46	2653	Пылеотсос ПА 218Б	840,00	42,00
47	2656	Пылеотсос ПА 218	781,20	39,06
48	3034	Станок обдирочно-шлифовальный 3К-633	268,80	13,44
49	3444	Станок радиально-сверлильный 2К 52-2	3 948,00	197,40
50	3498	Станок настольно-сверлильный ОС-15	462,00	23,10
51	3570	Пылеотсос В19-101	1 008,00	50,40
52	3573	Пылеотсос В19-101	1 008,00	50,40
53	3634	Печь термической закалки мелких партий деталей (нест.)	1 848,00	92,40
54	3751	Станок настольно-сверлильный ОС-15	462,00	23,10
55	3813	Станок вертикально-сверлильный МН-25-Н	1 764,00	88,20
56	1134	Станок заточной 36922	537,60	26,88
57	970	Пресс гидравлический П-6324	2 604,00	130,20
58	4529	Полуавтомат сварочный ПДГ-508М	2 184,00	109,20
59	204	Электросети кабельные	24 108,00	1 205,40
Оборудование, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, пр-д Октябрьский, 2				
60	449	Кран-балка г/п 3 т	2 772,00	138,60
61	162	Кран-балка г/п 2 т	2 100,00	105,00
62	46	Кран-балка г/п 3 т	2 772,00	138,60
63	2461	Кран-укосина ОПТ-1153 г/п 0,5 т	2 520,00	126,00
64	1359	Электротельфер г/п 0,5 т	1 428,00	71,40
65	570	Электроталь г/п 3,2 т	2 352,00	117,60
66	1658	Таль электрическая Т-10332 г/п 1 т	1 932,00	96,60
67	1242	Электроталь Т-10432 г/п 2 т	1 932,00	96,60
68	244	Электротельфер г/п 3 т	2 184,00	109,20
69	965	Силовое электротехническое оборудование и распределительные устройства	36 180,48	1 809,02
Оборудование, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47				
70	373	Испытательный стенд абразивных кругов СИП-800	2 604,00	130,20
71	1324	Станок токарный по дереву ТВ-200М	1 260,00	63,00

Капитальные строения в следующем составе:

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
72	**Здание трансформаторной подстанции № 4** (здание специализированное энергетики), инв. номер 250/С-29027, общая площадь 89,5 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, д. 101. **В состав лота входит:** секция шин РУ-10 кВ с КСО-272, секция шин РУ-0,4 кВ с автоматом АРУ-50, автомат нагрузки А3144, трансформатор силовой ТМ-1000/10, линия электропередачи кабельной напряжением до 10 кВ	90 902,28	4 545,11
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. 0,0156 га для использования под производственную базу			
73	Автостоянка (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства), инв. номер 250/С-39504, общ. пл. 3 130 кв. м, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, район ул. Ленинградская, 111. Составные части и принадлежности: площадка, эстакада	47 460,00	2 373,00
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. 0,3999 га для размещения автостоянки			

Порядок ознакомления: осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Буланов Андрей Викторович, 8029-596-82-43

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by, www.cpo.by

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Срок оплаты: не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

Затраты и вознаграждение (от 1 % до 10 %) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи, в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 25.05.2021 г.

Дата, место и время проведения аукциона	**29.06.2021 в 13.00 по адресу: ОАО «Технолит Полоцк», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская,101, 2-й этаж, актовый зал**
Дата, место и время окончания приема документов	**25.06.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже земельных участков в частную собственность в г. Жодино

Место расположения земельного участка и кадастровый номер	**земельный участок в микрорайоне «Кузнечный-3», по генплану № 334 в г. Жодино, 641300000001002304**	**земельный участок по ул. Советской, по генплану № 19 в г. Жодино, 641300000003001223**
Номер лота	**2**	**2**
Целевое назначение	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код по классификатору 1 09 02 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки – строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код по классификатору 1 09 02 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки – строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)
Площадь	**0,0996 га**	**0,1001 га**
Условия предоставления земельного участка, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений	Без изменения целевого назначения	Без изменения целевого назначения
Условия развития инфраструктуры застраиваемой территории	Возможность подключения к инженерным сетям: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение	Возможность подключения к инженерным сетям: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение
Ограничения в использовании	-	Площадью 0,0612 га – охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт
Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	**20 706,84**	**17 197,18**
Затраты	**930,33 + затраты на публикацию в СМИ**	**930,33 + затраты на публикацию в СМИ**
Сумма задатка, бел. руб.	**2 070,68**	**1 719,72**
Дата проведения аукциона	**16.07.2021**	**16.07.2021**
Последний день приема заявлений	**12.07.2021**	**12.07.2021**
Время проведения аукциона	**12.00**	**12.15**

Аукцион состоится по адресу: г. Жодино, ул. 40 лет Октября, 7, 4-й этаж, зал совещаний Жодинского горисполкома.

2. Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

2.1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.

2.2. Копию платежного документа, подтверждающего уплату задатка по лоту за выкуп **земельных участков в частную собственность** на счет ГУ МФ РБ по Минской области р/с BY75AKBB36006030000050000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 600537220, **назначение платежа 04901** (с пометкой «Задаток за земельный аукцион»). Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

2.3. Копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

3. **При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь обращаются по адресу: г. Жодино, ул. 40 лет Октября, 7, сектор землеустройства Жодинского горисполкома, каб. 208 либо каб. 209 с 8.30 до 17.30, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00.**

